Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 10 1933 г. № 126 (4670)

Год выданьня XVI

Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Забясьпечыць пасьпяховую рэалізацыю пазыкі на вёсцы. МІН-ХУА—Культурныя дасягненьні Савецкага Кітаю (3 стар.). З. БЯДУЛЯ і КРАПІВА — На калгасных палёх Лепельшчыны (2 стар.).

Дабіцца рашаючых зрухаў у выкананьні прамфінпляну, ва ўмацаваньні партыйнай дысцыпліны і паляпшэньня выхаваўчай работы (3 стар.)

Скончыліся ўсебеларускія спаборніцтвы па цяжкай атлётыцы і гімнастыцы (2 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Канфлікт паміж Японіяй і Англіяй (2 стар.).

Польшча не задаволена пактам чатырох (2 стар.).

У ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ. — Бязупынныя масавыя арышты і вобыскі ў рабочых раёнах (4 стар.).

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПАСЬПЯХОВУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ

Аднэй з магутных крыніц фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва вяўляюцца нашы масавыя дзяржаўныя пазыкі. Ні ў аднэй краіне ў сьвеце пазыкі не карыстаюцца такой папулярнасьцю, такім падтрыманьнем, як у краіне Саветаў. І гэта вуцім зразумела.

Нашы пазыкі, праз якія на працягу першай пяцігодкі накіраваны дзесяткі мільярдаў рублёў на фінансаваньне індустрыялізацыі, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, карыстаюцца шырокім падтрыманьнем сярод працоўных мас гораду і вёскі таму, што яны спалучаюць у сабе агульна-дзяржаўныя інтарэсы з інтарэсамі кожнага падпісчыка ў асобку, таму, што яны цалкам ідуць на патрэбы будаўніцтва сацыялізму.

На сродкі ад пазык пабудаваны сотні новых гігантаў індустрыі, фабрык, заводаў, электрастанцый, чыгуначных і шасэйных дарог. Стаялівыя коні — трактары, дзесяткі тысяч якіх працуюць на саўгасных і калгасных палёх, у значнай сваёй частцы пабудаваны на сродкі дзяржаўных пазык, на дробныя і драбнейшыя зьберажэньні працоўных мас.

У краінах капіталу, дзе пануе эксплёатацыя працоўных мас, пазыкі ідуць на ўзбраеньне, на фінансаваньне падрых тоўні новых войнаў. Фінансавая палітыка буржуазіі пагоршае становішча працоўных. Яна выкідвае на вуліцу мільёны беспрацоўных, асуджаных на жабрацтва і галечу. Нячуваныя падаткавыя плацяжы разбураюць нязьлічоныя гаспадаркі сялян і фэрмэраў.

Пралетары Савецкага саюзу ганарацца тым, што яны маюць магчымасьць даць у пазыку дзяржаве 3 мільярды рублёў на справу сацыялістычнага будаўніцтва, яны добра ведаюць, што наша фінансавая палітыка няўхільна павышае дабрабыт шырокіх працоўных мас.

Выніні рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі па БССР як нельга лепш пацьвярджаюць гэта. За дзьве дэкады сума рэалізацыі дасягнула 57 млн. рублёў. НА 8 ЧЭРВЕНЯ ЗАДАНЬНЕ ПА ГРУПЕ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ВЫКАНАНА НА 108,2 ПРОЦ., ПА КАЛГАСНЫМ СЭКТАРЫ—НА 114,4 ПРОЦ. Рабочыя калектывы фабрык і заводаў буйнейшых пралетарскіх цэнтраў Беларусі паказалі ўзоры рэалізацыі пазыкі. Шырокае разгортваньне па ўсіх цэхах, брыгадах, прадпрыемствах сацспаборніцтва і ўдарніцтва вакол падпіскі забясьпечыла на працягу вельмі кароткага тэрміну смаль поўны ахоп падпіскай усіх рабочых і служачых.

З ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ ПРАЙШЛА ПАДПІСКА ПА КАЛГАСНЫМ СЭКТАРЫ. Гэта сьведчыць аб вялізарным росьце палітычнай сьвядомасьці і матар'яльнага дабрабыту калгасных мас, аб узрастаючай арганізаванасьці калгаснага сялянства.

Выключна вялікі посьпех падпіскі на пазыку яшчэ раз дэманструе бязьмежную адданасьць шырокіх працоўных мас справе сацыялізму, генэральнай лініі партыі і яе ленінскаму ЦК, гатоўнасьць іх усімі сіламі і сродкамі змагацца за канчатковую перамогу сацыялізму.

На пазыку «Другая пяцігодка» падпісаліся ня толькі рабочыя, калгасьнікі і працоўныя нашай краіны, дзесяткі арэмежных рабочых, спэцыялістаў, якія працуюць на нашых фабрыках і заводах, падпісаліся на сумы, якія далёка перавышаюць іх месячны заработак. Гэта бліскучае адлюстраваньне вялікага міжнароднага значэньня нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Сіла і магутнасьць нашай краіны заключаецца імкнна ў тым, што мы будуем сацыялізм сваімі ўласнымі сродкамі БЕЗ КАБАЛЬНЫХ КРЭДЫТАЎ і пазык звонку.

Аднак, з усяго вышэйсказанага ні ў якім разе нельга зрабіць вывад, што кампанію рэалізацыі пазыкі ня трэба арганізоўваць, што яна можа ісьці самацёкам. Толькі разгортваньне масавай работы можа забясьпечыць посьпех кампаніі, замацаваць вялікі ўздым энтузіязму працоўных.

Аб значэньні арганізацыйна-масавай работы з усёй відавочнасьцю гаворыць вопыт рэалізацыі пазыкі на вёсцы. Гэта самы адказны, але і самы адсталы вучастак нашай работы па пазыцы. На гэтым вучастку клясавы вораг аказвае асаблівае шалёнае супраціўленьне мерапрыемствам партыі і ўраду. Добра ўлічваючы значэньне дзяржаўных пазык, ён усімі сродкамі прабуе сарваць пасьпяховую рэалізацыю пазыкі «Другая пяцігодка».

Зразумела, нельга адмаўляць значных зрухаў у рэалізацыі дзяржаўных пазык на вёсцы, дасягнутых за апошнія гады. Посьпехі індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, рост дабрабыту працоўных мас калгаснай вёскі, дасягненьні ў сацыялістычным перавыхаваньні калгаснага сялянства стварылі магутную базу для разьвіцьця дзяржаўнага крэдыту на вёсцы. Аб гэтым гаворыць той факт, што сярод калгасьнікаў БССР рэалізавана 114,4 проц. заданьня. Аднак, агульныя выні кі рэалізацыі пазыкі на вёсцы нездавальняючыя. Заданьне выканана толькі на 56,7 проц. АСАБЛІВА АДСТАЕ АДНААСОБНЫ СЭКТАР, ДЗЕ ПЛЯН ВЫКАНАН НА 4,7 проц. Больш таго, плян па калгасным сэктары выканан галоўным чынам за лік перадавых раёнаў і калгасаў. Усё гэта гаворыць аб недастатковай удзельнай вазе аднаасобнага сэктару ў нашым дзяржаўным крэдыце, аб неабходнасьці карэннай перабудовы работы па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

НІ АДНАГО КАЛГАСЬНІКА, НІ АДНАГО ПРАЦОЎНАГА АДНААСОБНІКА БЕЗ АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ — вось лёзунг, вакол якога павінна быць мабілізавана ўся савецкая грамадзкасьць.

Зразумела, што асноўнымі мэтадамі падпіскі зьяўляюцца масавая работа, паказ вопыту лепшых, растлумачэньне і пераканаьне. Поўная добраахвотнасьць — вось галоўны прынцып рэалізацыі, трэба жорстка біць па спробах адміністраваньня і прымусовага навязваньня падпіскі. Рэалізацыя пазыкі на вёсцы, як і ў горадзе, павінна праводзіцца выключна шляхам разгортваньня палітычна-масавай работы, шляхам спаборніцтва і ўдарніцтва, шляхам грамадзкага букёру перадавых раёнаў, сельсаветаў, калгасаў, вёсак над адсталымі.

Факты сьведчаць аб тым, што рад раёнаў БССР ня ўзяўся як належыць за правядзеньне падпіскі кампаніі. ТАЛАЧЫНСКІ раён заданьне па вёсцы выканаў на 28,5 проц., УВАРАВІЦКІ — на 20,9 проц., БЕШАНКОВІЦКІ — на 20,5 проц., КЛІЧАЎСКІ — на 22,0 проц. Гэта сапраўды ганебная работа, якая зьяўляецца пепшым паказам бязьдзейнасьці, бездапаможнасьці мясцовых арганізацый. Яшчэ горш стаіць справа па аднаасобным сэктары. ЧЭРЫКАЎСКІ, УВАРАВІЦКІ, ЛЁЗНЯНСКІ, АСЬВЕЙСКІ, КАМАРЫНСКІ раёны не рэалізавалі сярод аднаасобнікаў ні на адзін рубель.

Прычыны ў тым, што кіруючыя арганізацыі і фінансавыя органы гэтых раёнаў недаацанілі палітычнага значэньня ахопу падпіскай аднаасобнага сялянства. Яны ня сталі на чале кампаніі, не мабілізавалі шырокіх мас калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў вакол пазыкі, яны цалкам пакладліся на самацёк. Мясцовыя арганізацыі ў гэтых раёнах пашлі па лініі найменшага супраціўленьня — яны выконвалі заданьне за лік гарадзкога насельніцтва і перадавых калгасаў, пакінуўшы аднаасобную вёску на заднім пляне. Ва многіх раёнах наглядаюцца спробы працягнуць апартуністычную тэорыю «чарговасьці кампаній»: «Раней скончым сяўбу, а потым возьмемся за пазыку».

Гэтымі «тэорыйкамі» прыкрываюць няўменьне злучыць ажыцьцяўленьне важнейшых мерапрыемстваў на вёсцы, прыкрываюць бязьдзейнасьць і няздольнасьць працаваць па-баявому. Трэба ўмець злучыць праведзеньне важнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній.

Пралетарская грамадзкасьць катэгарычна патрабуе ад усіх арганізацый адсталых раёнаў падцягнуцца і шляхам АРГАНІЗАЦЫІ падпіскі забясьпечыць пасьпяховую рэалізацыю пазыкі на вёсцы, асабліва па аднаасобным сэктары. Ёсьць усе магчымасьці для гэтага. Няма такіх прычын, якія маглі-б апраўдаць дрэнную работу. Хіба бліскучая рэалізацыя пазыкі ў пасобных сельскіх саветах і калгасах, якія перавыканалі кантрольныя заданьні, не зьяўляюцца доказам адсутнасьці ўсякіх аб'ектыўных прычын, за якімі маглі-б схавацца «героі» апартуністычных тэмпаў.

Прафэсыянальныя арганізацыі павінны максымум увагі аддаць падпіской кампаніі на вёсцы. Дырэктыва УсеЦСПС аб тым, што «ні адна прафсаюзная арганізацыя, ні адно прадпрыемства гораду ня можа лічыць выкананымі свае абавязкі па пазыцы другой пяцігодкі, пакуль на скончана падпіска ў падшэфным раёне, вёсцы, калгасе» — павінна быць поўнасьцю выканана.

Бальшавіцкую арганізаванасьць у рэалізацыі пазыкі, якую дэманстравалі буйнейшыя пралетарскія цэнтры БССР, трэба перанесьці ў сельскія раёны і сельсаветы. Перадаць лепшыя формы і мэтады рэалізацыі пазыкі ў гарадох і перадавых калгасах адсталым сельсаветам і вёскам — вось задача ўсіх раённых арганізацый, усіх фінансава-крэдытных устаноў.

Безагаворачна выканаць дырэктыву ЦК і СНК, неадкладна завяршыць сяўбу

Разгарнуць ворыва папараў і праполку, заваяваць пяршынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю

БССР

Засеяна **2.320.907** *га—***86,6** *проц.*

ПРЫРОСТ ЗА ПЯЦІДНЕЎКУ 4,8 ПРОЦ.

Зах. вобласьць

Засеяна **2.439.800** *га—***71,8** *проц.*

ПРЫРОСТ ЗА ПЯЦІДНЕЎКУ 9,6 ПРОЦ.

Віцебскія „выпадкі"

ВІЦЕБСК. (Ад нашых карэспандэнтаў).

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» ад 9 чэрвеня мы ўказалі на недапушчальнае адставаньне аднаасобнага сэктару ў Віцебскім раёне. Сёньня спынімся па калгасах.

Да 1-га чэрвеня па калгасах плян сяўбы быў выканан на 64,1 проц., а на 5 чэрвеня — 75,6. Прырост за пяцідзеўку яўна нездавальняючы — 11,5 проц. Два-тры процанты ў дзень —такі «размах» застаецца нязьменнай меркай віцебскіх тэмпаў сяўбы і зараз пасьля тэлеграмы т. т. Гікало і Галадзеда.

Ёсьць пагроза, што нават і расьцягнутыя тэрміны, вызначаныя гаркомам партыі, у радзе сельсаветаў таксама будуць сарваны. Гарком і гарсавет не забясьпечылі бальшавіцкага пералому ў ходзе сяўбы, ня ўдарылі з усёй сілай па кулацкім сабатажы сяўбы, які з усёй яснасьцю выявіўся ў радзе калгасаў раёну.

Возьмем буйнейшы ў раёне РУДНІЦКІ сельсавет. Тут калгасы павінны засеяць 2.110,91 гэкт., аднаасобнікі—528 гэктараў. Плян выканан толькі на палову, а па аднаасобных гаспадарках—усяго на 39 проц.

У калгасе імя Ланцуцкага—4 брыгады. Брыгадзіры, улічваючы свае магчымасьці, вызначылі скончыць сяўбу 7 чэрвеня. Старшыня-ж калгасу Закржэўскі сваёй адміністрацыйнай уладай загадаў: тры брыгады канчаюць сяўбу 8 чэрвеня, а 4 брыгады —11 чэрвеня. І гэта ў той час, калі ў калгасе імя Ланцуцкага на 5 чэрвеня заставалася ўзараць толькі 6 гэктараў на... 60 коняй.

Сабатаж з боку старшыні калгасу —няпрыкрыты.

Што-ж робіць парт'ячэйка? Яна вы ключае з партыі Закржэўскага. Правільна. А што больш? Нічога. Закржэўскі застаецца і зараз старшынёй калгасу. Упаўнаважаны гаркому т. Фалкін піша Закржэўскаму ультыматум, прапануе, пагражае, папярэджвае. Што з гэтага выйдзе— невядома.

Чаму зараз-жа ня быў зьнят з работы кулацкі агент, выключаны з партыі?

— Такі парадак у Віцебскім. Ёсьць выпадкі, што і сакратарамі парт'ячэек пэўны час застаюцца выключаныя з партыі,—шчыра прызнаецца т. **ФАЛКІН**, загадчык агітмасу гаркому.

Нішто сабе «парадак і выпадкі»!?..

Дзіўная лёгіка ў віцебскіх арганізацый. Прымаючы тое ці іншае рашэньне, яго не даводзяць да канца. І так заўсёды. Грозных пастаноў коль кі хочаце і... ўсё па-старому. Вось факт зноў з таго-ж Рудніцкага сельсавету. Апошняй пастановай гаркому старшыня Рудніцкага сельсавету Міхееў зьнят з работы, яму абвешчана суровая вымова. Гэта афіцыяльна, на паперы. На справе-ж наадварот: Міхееў і **ЗАРАЗ ПРАЦУЕ** старшынёй.

І яшчэ факт. Доўгі час упаўнаважаным гаркому і гарсавету па Рудніцкім сельсавеце быў загадчык райземаддзелу Брыкаў. У канцы мая, калі выявілася, што Брыкаў праваль вае сяўбу, яго ціхенька зьнялі з пасады ўпаўнаважанага па сельсавеце і прызначылі брыгадзірам у калгасе імя Войкава. І тут Брыкаў дапамагае праўленьню калгасу зрываць тэрміны сяўбы. Брыкаў піша ў сельсавет новаму ўпаўнаважанаму гаркому тав. Фалкіну запіскі: «Надвор'е не дае магчымасьці сеяць». І гэта—ў канцы мая — дакладна—29 мая.

Ці ведае аб гэтым гарком, гарсавет?

Ведаюць. І тым ня менш Брыкаў застаецца... загадчыкам райземаддзелу і носіць партбілет у кішэні.

Або вось калгас «Новае жыцьцё». Яшчэ 27 мая, калі ў калгасе плян сяўбы быў выканан на 35 проц., старшыня калгасу Андрыенка зьнімае з поля коняй, ставіць на апрацоўку гародаў калгасьнікаў і сам выяжджае на свой гарод першым. Ня дзіва, што і зараз плян сяўбы па калгасе выканан толькі на 51,2 проц.

Брыгады ў калгасах арганізаваны не па вытворчым прынцыпе. Напрыклад, у калгасе «Новае жыцьцё» у першай брыгадзе на каня нагрузка— 3 гэктары, а ў 2 брыгадзе—8,5 гэктара.

У калгасе «Бальшавік» брыгадзірам вызначан Саладухін, які штомінутна лемантуе: «Дайце рады, я— кравец, я сельскай гаспадаркі ня ведаю». Гэты калгас найбольш адстае: плян выканан на 39,6 проц.

Прагулы, спазьненьні, сыстэматычныя нявыхады на работу—такое ста новішча працоўнай дысцыпліны. Масава-палітычная работа сярод калгасьнікаў не вядзецца. Парт'ячэйка ня ведае калгаснага актыву, работы з ім не вядзе ніякай. Настаўніцтва (2 ШКМ, апрача пачатковых школ) ня прымае амаль ніякага ўдзелу ў працы сярод калгасьнікаў.

А магчымасьці ў Рудніцкім сельсавеце, як і ў іншых сельсаветах, вялікія: сяўбу закончыць можна было даўно. Уся бяда ў тым, што раённыя арганізацыі не забясьпечылі сяўбу апэрацыйным кіраўніцтвам. Аб гэтым сьведчаць нават факты з практыкі апошніх дзён. У Рудніцкі сельсавет два разы прыяжджаў намесьнік загадчыка райза Паўленка, але ён ма ланкай пранёсься на машыне і зьнік бясьсьледна, пашумеўшы, нічога канкрэтнага не зрабіўшы.

6 чэрвеня ў сельсавет прыехалі на «фордзе» сакратар гаркому т. Міцькоў і старшыня гарсавету т. Кардашэнка. Прыехалі, зайшлі ў хатучытальню, пагутарылі з упаўнаважаным Фалкіным і—візыт скончан...

У калгасную брыгаду, на поле, дзе сеюць, ніхто не зазірнуў. У гэты-ж дзень таталася ў сельсавеце зранку да вечара 11 чалавек сельсавецкага актыву.

Так, у Віцебску, з дазволу сказаць, кіруюць сяўбой. Ці-ж незразумела пасьля гэтага, што прычына ганебна га адставаньня Віцебшчыны ў сяўбе перш за ўсё ў саноўна-панскіх мэтадах кіраўніцтва?

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.
А. МІКУЦКІ.

МАГІЛЕЎ ВЫКАНАЎ ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ

МАГІЛЕЎ. (Па тэлеграфу).

У рэзультаце жорсткай крытыкі з боку ЦК, СНК і ЦО «Зьвязда» памылак і недахопаў раённага кіраўніцтва ў барацьбе за сяўбу Магілеўскі раён перамагае адставаньне.

7-га чэрвеня плян веснавой сяўбы выканан. Заданьне па яравым кліне —61.934 га, засеяна—61.946 гэктараў.

Сяўба працягваецца.

КАЛОДКА, САПРЫЦКІ.

***

Зьмяшчаючы тэлеграму Магілеўскага РК і РВК, рэдакцыя лічыць неабходным адзначыць:

У цэлым радзе сельсаветаў Магілеўшчыны дапушчаны факты абурачога ашуканства пры складаньні зводак аб выкананьні пасеўных плянаў. У зводках адзначалася не фактычнае выкананьне пасеўных плянаў, а агульная колькасьць гэктараў, якія яшчэ трэба было засеяць.

У прыватнасьці, у Дашкаўскім, Селецкім і іншых сельсаветах старшыні сельсаветаў складалі зводкі аб выкананьні плянаў па цэлых тры дні наперад. У распараджэньні редакцыі ёсьць яшчэ цэлы рад аналёгічных фактаў.

Ці праверыла магілеўскае кіраўніцтва фактычнае становішча сяўбы? Неабходзен ясны і вычарпальны адказ.

Чырвоная дошка

Пастановай камісіі ЦК КП(б)Б па спаборніцтву з Заходняй вобласьцю за ганебныя тэмпы сяўбы занесены на чорную дошку наступныя раёны:

ПАУДНЁВАЯ ЗОНА

ВЕТКА — 87 проц. Сакратар РК КП(б)Б КАЎРЫГІН, старшыня РВК СЬЛІЎКІН.

ЦЕРАХАЎКА — 92,5 проц. Сакратар РК СУРБА, старшыня РВК ДУПАНАЎ.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА

ГОРКІ — 78 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЧОРНАБРОДАЎ, старшыня РВК КАНДРАЛЬ.

МСЬЦІСЛАЎЕ — 78,4 проц. Сакратар РК КП(б)Б РАМАНЕНКА, старшыня РВК МАРОН.

ТАЛАЧЫН—81,2 проц. Сакратар РК КП(б)Б СЛАВІН, старшыня РВК ЛОЦМАНАЎ.

ДЗЯРЖЫНСК — 82,5 проц. Сакратар РК ДАМБРОЎСКІ, старшыня РВК ВАНСОЎСКІ.

ПАУНОЧНАЯ ЗОНА

СІРОЦІНА — 51,8 проц. Сакратар РК КП(б)Б МІРОНЕНКА, старшыня РВК ЦОФІН.

ГАРАДОК — 56 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЭЛЬМАН, старшыня РВК ЕЎДАСЕЎ.

БЕШАНКОВІЧЫ — 57,9 проц. Сакратар РК ЯКАЎЛЕЎ, старшыня РВК ШАХ.

ВІЦЕБСК — 65,7 проц. Сакратар РК КП(б)Б МІЦЬКОЎ, старшыня РВК КАРДАШЭНКА.

КАНТРОЛЬНЫ АБМЕР ПАСЕЎНЫХ ПЛОШЧАЎ

10-га чэрвеня па БССР пачынаецца кантрольны абмер пасеўных плошчаў 1933 г. Абмер будзе праведзен па 45 раёнах, галоўным чынам, у раёнах з буйнымі збожжавымі масывамі і ў раёнах тэхнічных культур. Усяго вызначана абмераць каля 400 тыс. гэктараў.

Для правядзеньня гэтай работы Наркамзем накіроўвае ў раёны і сельсаветы 500 каморнікаў. У дапамогу ім будзе прыцягнут актыў калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў з тым, каб да 1-га ліпеня гэта работа была закончана.

Абмер пасеўных плошчаў гэтага году набывае вялікае палітычнае і гаспадарчае значэньне. Ён павінен выявіць сапраўдны малюнак дакладных разьмераў пасеваў 1933 году, уключаючы і пасевы азімых.

Большасьць раённых і цэнтральных арганізацый БССР ня ведаюць дакладных разьмераў пасеўных плошчаў. Узяць хоць-бы Воршу або Клімавічы. Тут разыходжаньні паміж афіцыяльнымі зводкамі і сапраўды засеянымі плошчамі дасягаюць 3.000 гэктараў. Факты ашуканства і адсутнасьці ўсякага ўліку яшчэ маюць значнае пашырэньне. Таму ў нашых умовах праводзімы абмер мае актуальнейшае значэньне.

У мінулыя гады таксама праводзіўся 10-процантны абмер плошчаў, але ён не даваў станоўчых вынікаў, бо праводзіўся прымітыўным спосабам бяз інструментаў—меральі крокамі, вяроўкамі, прычым рабілі гэта людзі ў большасьці непадрыхтаваныя. Грамадзкасьць зусім ня прымала ўдзелу ў гэтай справе.

У гэтым годзе абмер будзе праводзіцца кваліфікаванымі работнікамі пры дапамозе адпаведных інструментаў. Усякі абмер па вока катэгарычна забаронен.

Задача партыйных і савецкіх арганізацый у вёсцы, асабліва камсамолу, узначаліць гэту работу, устанавіць за ёю грамадзкі кантроль, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на выяўленьне ўсёй засеянай зямельнай плошчы.

Мясцовы раённы нізавы друк павінен прыняць актыўны ўдзел у гэтым важнейшым мерапрыемстве.

ЗАМАЦОЎВАЕМ ПОСЬПЕХІ СЯЎБЫ

РАГАЧОЎ, 9. (БЕЛТА).

Паасобныя калгасы раёну па-баявому разгортваюць праполачныя работы і рыхтуюцца да ўборкі.

Калгас імя Сталіна, які абслугоўваецца МТС, да 7 чэрвеня ПОЎНАСЬЦЮ УЗАРАЎ ПАПАРЫ НА ПЛОШЧЫ Ў 52 ГА. Папар узоран добраякасна на глыбіні 15 сантыметраў. Лепшы прыклад работы па ворыве папараў паказалі калгасьнікі-ўдарнікі: Кушэрбін П., Ісаеў П., Зьвягаў Я., Рузін і інш., якія перавыконваюць норму на 0,1, 0,15 га (норма 0,7 га) пры добраякасным ворыве — без агрэхаў і глыбока.

Калгас імя Калініна разгарнуў праполку. Праполата зьвыш 4 га шпаніцы. Лепшыя прыклады па гэтай рабоце паказваюць: Курачкіна Н., Курачкіна Ульяна, Пілішенка Поля. Яны аккуратна выходзяць на работу і з карэньнем вырываюць пустазельле з пасеваў.

У гэтым калгасе арганізаваны ясьлі на 35 дзяцей, што дае магчымасьць поўнасьцю скарыстаць жапочую сілу на праполачных работах.

Калгас забараніваў 60 га бульбы. Праполата 0,5 га клубнікі. Падрыхтаваны да ўборачнай 2 жнівяркі, да якіх прымацаваны зерняўлоўлікі, падрыхтаваны таксама 4 сенакасілкі, 2 конных грабель і ўвесь рэчны інвэнтар: косы, граблі, малаткі, бабкі і г. д. Гумны і сьвірны, дзе будзе захоўвацца ўраджай, прыведзены ў парадак, ачышчаны ад сьмецьця і адрамантаваны. Трое слабейшых коняй пастаўлены на адпачынак, каб падрыхтаваць іх да ўборачнай. Камсамольцы калгасу арганізавалі брыгады дазораў па ахове пасеваў ад патравы.

Таксама добра арганізаваў работу і калгас «Аганёк». У калгасе адрамантаваны 2 жнівяркі, 2 сенакасілкі, 2 конных грабель, набыта 10 новых кос, прыведзены ў парадак 24 старыя косы, малаткі, бабкі і інш. 8 коняй, якія будуць скарыстаны на сенакашэньні і жніве, пастаўлены на адпачынак.

У калгасе імя Сьвярдлова поўнасьцю адрамантаваны 2 сенакасілкі, 3 конных грабель, 4 жнівяркі. Прыладамі да сенаўборкі калгас поўнасьцю забясьпечан. Ёсьць патрэбная колькасьць малаткоў, брускоў, асялкоў і інш. У кожнай брыгадзе створаны звеньні касцоў, якія ведаюць вучастки, дзе яны павінны ўбіраць сена. Калгас канчае пабудову двух вялікіх гумнаў, дзе будзе складацца ўраджай, і ўжо ачысьціў і адрамантаваў 15 гумнаў малых для складаньня сена.

Калгас імя Варашылава забараніваў ужо 125 га бульбы.

Машыны—уборачнай

Белмэталяаб'яднаньне ігнаруе выраб запасных частак да ўборачных машын

З вырабам запчастак не сьпяшаюцца

У радзе калгасаў і саўгасаў БССР пачалася праполка. Хутка пачнецца касьба, уборка каласавых. Тэрміны вельмі жорсткія. Партыя і ўрад патрабуюць своячасовага рамонту ўборачных машын і выкананьня заказаў на запчастакі да іх. Аднак, у асобных раёнах БССР з падрыхтоўкай да ўборкі не сьпяшаюцца. Кіраўніцтва гэтых раёнаў працуе яшчэ па-старыцы: спачатку, мо, упразіюся з сяўбой, потым возьмемся за падрыхтоўку да ўборкі. А тое, што ў некаторых калгасах, саўгасах, МТС больш паловы ўборачнага інвэнтару адчуває патрэбу ў рамонце, а на рамонт, як вядома, патрэбен час,—нікога не датычыць. Узяць, да прыкладу, Гомельскую МТС. У раёне яе дзейнасьці, паводле няпоўных даных, з 15 касарак 7 патрабуюць рамонту, з 14 конных граблёў—палова паламана, з 17 жнівярак толькі 4 спраўныя. Як ідзе рамонт, ці будуць яны адрамантаваны да тэрміну — кіраўнікі МТС ня ведаюць. У МТС і МТМ няма нават пляну рамонту ўборачных машын і малатарань. А Гомельская-ж МТС лічыцца адной з лепшых.

Вельмі кепска стаіць справа з вырабам запчастак да ўборачных машын. Белмэталяаб'яднаньне ўзяло буйны заказ на выраб запчастак да сенакасарак, жнівярак, конных прыладаў, малатарань і г. д. Заказ разьмеркаван паміж трыма заводамі: «Чырвоны мэталіст» (Віцебск), «Чырвоны барэц» (Ворша), «Рухавік рэвалюцыі» (Гомель). Задача першых партый дэталяў павінна была пачацца яшчэ ў лютым.

Прайшло чатыры месяцы. Як-жа ідзе выкананьне заказу? Аб гэтым у Белмэталяаб'яднаньні ня ведаюць. Зданы ўжо першыя партыі дэталяў ці не, якія іменна дэталі, якасьць іх і г. д. —усё гэта для работнікаў Белмэталяаб'яднаньня невядома. Дырэктар Белмэталяаб'яднаньня т. Лепін толькі 22 мая разаслаў заводам адносіну з просьбай па ведамляць штодзённа, пачынаючы з 1 чэрвеня, як ідзе выраб запчастак. Гэта адносіна наскрозь прасякнута абыякавасьцю і абтомаўскім спакоем. «Просім паведамляць штодзённа», у той час, як дорат ня толькі кожны дзень, але і кожная гадзіна падрыхтоўкі да ўборачнай. А ў Белмэталяаб'яднаньні найменшай адзінкай часу зьяўляецца дэкада. Такім чынам весткі яны ня хутка атрымаюць.

Але сёе-тое стала вядома паміма заводак Белмэталяаб'яднаньня. Вось што робіцца, напрыклад, на гомельскім заводзе «Рухавік рэвалюцыі». Паўтары тысячы пасьцяронак для жнівярак маглі быць даўно аданы заказчыку, але ў пасьцяронках трэба вытачыць канаўкі для шпонак і гэту работу выконвае адзін варыятат. Тысяча пасьцяронак чакае сваёй чаргі і можа чакаць да глыбокай восені, калі кіраўнікі заводу не пераключаць на гэту работу хоць-бы яшчэ адзін варыятат. На заводзе-ж робіцца наадварот. Майстры такарнага цэху вельмі часта і гэты адзіны працуючы пад запчасткамі варыятат загружаюць іншай работай. Няўважлівыя, нашляпацельскія адносіны да вырабу запчастак адбіваюцца на іх якасьці. Брак вельмі вялікі. 200 пасьцяронак, 300 упулак, 600 поршняў—вось «скромныя» лічбы браку. Вінаватых шмат, але іх па чыстую ваду ня выводзяць. Ці варта, калі пытарка ідзе аб нейкіх запчастках да ўборачных машын!

Рабочая грамадзкасьць на гэту справу не мабілізавана. Прафарганізацыя яшчэ адпачывае пасьля перазаключэньня калдагавору. У ЦП сапраў машынабудаўніцтва з гэтым пытаньнем таксама не сьпяшаюцца. Там выбіраюцца пастаянныя пытаньні пра выраб запчастак на абгаварэньне пленуму толькі 13 чэрвеня.

Побач з «Рухавіком рэвалюцыі» знаходзіцца беларускі гігант машынабудаўніцтва—Гомсельмаш. Завод на гаспадарчай лініі падпачален непасрэдна Саюзсельмашу, а па прафсаюзнай—ЦК саюзу машынабудаўніцтва. Але і тут малюнак той-жа самы. У вырабе запчастак для ўборачных машын поўны самацёк. Плянавік ліцейнага цэху Малеў не саромяцца заяўляць, што заказы для ўборачных машын ён выконвае ў апошнюю чаргу. Калі фармаўшчыком няма чаго рабіць, тады толькі ім падсоўваюць нарады па запчастках.

Гомсельмаш выконвае буйны заказ Любарэцкага заводу на запчасткі да іньнацерабінак. Да 1 чэрвеня Гомсельмаш павінен быў адаць заказчыку 300 камплектаў розных дэталяў у колькасьці 16 штук. На 26 мая было выпушчана ТОЛЬКІ 11 ДЭТАЛЯЎ. Рэшта знаходзіцца яшчэ ў працэсе апрацоўкі. Апрача таго, Гомсельмаш выконвае буйны заказ Белсельгаснабу. 70 проц. гэтага заказу трэба было закончыць згодна дагавору да 1 чэрвеня, але выканан ён дагэтуль толькі на процантаў 30.

Менскі завод па вырабу ланцугоў Галя (аб якім «Правда» гэтымі днямі пісала ў перадавой) павінен адаць Ростсельмашу 45.000 мэтраў ланцугоў. Першыя 3 тысячы мэтраў былі забракаваны, бо былі зроблены з нядобраякаснай сталі. Зараз завод атрымаў неабходны гатунак сталі, але тэмпы работы далёка не забясьпечваюць выкананьня заказу ў тэрмін.

Так стаіць справа з вырабам запчастак для ўборачных машын. Ці трэба гаварыць аб тым, што апартуністычная абыякавасьці да гэтай справы трэба пакласьці канец? Для кожнай партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі, для кожнага гаспадарніка гэта павінна быць зразумелым.

П.

Падрыхтоўкай да ўборкі на „Чырвоным мэталісьце" ня цікавяцца

ВІЦЕБСКІ ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ» у часе пасеўнай кампаніі па вырабу запасных частак да трактараў даў ня дрэнны прыклад ударнай бальшавіцкай работы.

Зусім іншая справа цяпер. Завод узяў на сябе абавязкі вырабіць запасныя часткі для малатарань, конных прыладоў, сенакасарак і да 1 чэрвеня здаць 12 тысяч акучнікаў. Выкананьне гэтага заказу правальваецца.

Заводакіраўніцтва, партыйна-камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі ня здолелі мабілізаваць рабочых, стварыць умовы для своячасовага выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў.

Ліцейны цэх з патрэбных 300 націскных ролікаў да прыладу «Бадзеньня» не адліў ні аднаго. З 200 адлітых падвойных шасьцяронак да малатарні «Ланцэ» — 50 проц. браку.

Ня лепш ідзе праца і ў такарным цэху. З 200 малых цыліндрычных шасьцяронак да прыладу «СМП-2» апрацавана ТОЛЬКІ 41. За апрацоўку ўкладышаў барабанных валаў да малатарні «БДО-34», якіх адліта ўжо 220 штук, такарны цэх зусім ня браўся. Не распачата работа і па апрацоўцы іншых дэталяў, як, напрыклад, падвойных шасьцяронак да малатарні «Ланцэ». Такарны цэх зусім адмяжоўваецца ад уборачнага заказу. Заказ чамусьці марынуецца ў кішэні плянавіка цэху тав. СЬМЯТАНІНА, аб ім ня ведаюць ня толькі рабочыя, але нават і начальнік цэху тав. Гаук.

Майстар першай зьмены тав. Бадзераў гаворыць, што дэталі да запасных частак даюцца апрацоўваць рабочаму толькі тады, калі няма іншай работы, калі пагражае прастой.

На заводзе няма плянавасьці ў рабоце, дагаворанасьці паміж цэхамі. Ліцейны цэх замест 300 тарцовых малых цыліндрычных шасьцяронак да паўтарамоцнага прыладу адліў толькі 35 таму, што тэхнічны аддзел заводакіраўніцтва больш месяца рыхтаваў чарцёж мадэлі.

За выраб запасных частак для сенакасарак завод зусім яшчэ ня браўся. Уся справа ў рамонтным цэху, які затрымаў выраб штампу для ложак мадэлі для калёс, між тым, як гэтае заказ трэба было скончыць ДА 1-ГА ЧЭРВЕНЯ.

Крыху лепш справа з вырабам акучнікаў. Намечана выпусьціць 12 тысяч акучнікаў; на сёньняшні дзень паўфабрыкатаў падрыхтавана на тысяч штук, а абарачным цэ

СКОНЧЫЛІСЯ УСЕБЕЛАРУСКІЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПА ЦЯЖКАЙ АТЛЕТЫЦЫ І ГІМНАСТЫЦЫ

8-ае чэрвеня ў клюбе кірчавікоў імя тав. Сталіна адбыўся заключны ўрачысты вечар, прысьвечаны закрыцьцю Усебеларускіх спаборніцтваў па цяжкай атлетыцы і гімнастыцы.

З дакладам аб рэзультатах спаборніцтва выступіў нам. старшыні ВСФК БССР тав. Кузьняцоў.

Дакладчык адзначыў вялікае значэньне праведзеных спаборніцтваў для далейшага разьвіцьця фізкультурнага руху БССР. Спаборніцтвы адбываліся напярэдадні дзьвёх важнейшых дат: пасяджэньня фізкультурнай арганізацыі БССР і адкрыцьця ўсесаюзных спаборніцтваў па цяжкай атлетыцы і гімнастыцы.

Тав. ВАЙНІЛОВІЧ («Дынамо») заняў першае месца ў спаборніцтве па падняцьцю цяжараў.

Усебеларускія спаборніцтвы паказалі, што ў нас фармуецца новы тып фізкультурніка, які ўладае ўсебаковым фізічным разьвіцьцём, фізкультурніка, які мае паўна акрэсьленую волю, мэтаімкнёнасьць у справе барацьбы за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, у справе ўмацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны. Рост гэтага новага тыпу фізкультурніка ў нашым руху — вось галоўная сутнасьць праведзенага налі сьвята.

Далей тав Кузьняцоў спыняецца на пытаньні аб задачах спартыўна-тэхнічнай работы. Асьць людзі, якія займаюцца разважаньнямі нібы спартыўна-тэхнічная работа ў нас зусім заняпала, нібы мы чуваем на месцы, а ня ідзем наперад па шляху да новых перамог у фізкультурным выхаваньні рабочай моладзі. За гэтымі разважаньнямі хаваюцца шкодныя імкненьні выпустаньць палітычную сутнасьць напала фізкультурнага руху і паставіць у цэнтры ўвагі «чыста» спартыўна-тэхнічную работу.

Гэтыя настрої павінны сустрэць рашучы адпор. Наша задача — сапраўды правільна накіраваць спартыўна-тэхнічную работу і на аснове масавай вучобы зрабіць яе здабыткам шырокіх мас фізкультурнікаў.

Ня гледзячы на асобныя недахопы ў нашай рабоце, нашы посьпехі вялізарныя.

У спаборніцтвах у 1928 годзе прымала ўдзел усяго 60-70 чалавек, а ў фізкультурным сьвяце гэтага году лік удзельнікаў складае ўжо звыш 200 чалавек. Партыйна-камсамольская праслойка ўдзельнікаў усебеларускага спаборніцтва складае 50 проц. З 200 фізкультурнікаў, якія прымаюць удзел у спаборніцтвах, — 123 рабочых.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб няўхільным росьце і ўмацаваньні фізкультурнай арганізацыі БССР. Ці ня лепшым паказальнікам росту фізкультурнага руху зьяўляецца той факт, што 85 проц. усіх удзельнікаў усебеларускага спаборніцтва — гэта фізкультурнікі, якія здалі нормы па комплексе «ГПА». Наш рух ідзе па правільным шляху, па шляху, які паказвае нам партыя, па якім яна нас вядзе.

Дакладчык падкрэсьлівае неабходнасьць яшчэ большага ўзмацненьня клясавай пільнасьці на фізкультурным участку. Факты вылазак клясавага ворага на фізкультурным фронце ў Віцебску, Гомелі, Горках гаворыць аб тым, што задача мабілізацыі мас фізкультурнікаў на жорсткі адпор клясава-варожым элементам павінна стаць у цэнтры ўвагі.

***

Старшыня галоўсуда на спаборніцтвах тав. Гольдбэрг абвясьчае рэзультаты ўсебеларускага фізкультурнага сьвята.

ТЭХНІЧНЫЯ РЭЗУЛЬТАТЫ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА СПАБОРНІЦТВА

Па гімнастыцы. Першае месца заняла каманда **Віцебску.** На другім месцы — **Менск,** трэцім — **Ворша,** чацьвертым — **Гомель.** Індывідуальна лепшыя паказальнікі далі: т. **Бяпы** (Віцебск); па жаночай групе т. т. **Панамарэнка, Шэвдава і Лебедзева.**

Па барацьбе. Першае месца—**Менск,** другое — **Гомель,** трэцяе — **Бабруйск.** Лепшыя барцы — т. т. **Іоселевіч, Майзэльс, Люлякоў, Міроскі, Рубін, Муравіцкі** (Менск), **Стулькевіч** (Гомель).

Па падыманьні цяжараў. Першае месца заняў **Менск,** другое — **Віцебск,** трэцяе — **Бабруйск,** чацьвертае — **Полацак.** Лепшыя дасягненьні паказалі т. т. **Лапідус, Іоселевіч, Вайніловіч** (Менск), **Самковіч** (Віцебск), **Масаловіч** (Ворша), **Мілееў** (Віцебск).

Па боксе. Першае месца прысуджана **Менску,** другое **Магілеву,** трэцяе **Гомелю.** Індывідуальнае першынства атрымалі т. т. **Сухарукаў, Панасюк** (Менск), **Лукшыц, Гарцэвіч** (Магілеў), **Озераў** (Бабруйск).

Па стральбе. Першае месца засталася за **Менскам,** другое — за **Гомелем,** трэцяе — за **Бабруйскам.** Лепшыя паказальнікі далі т. т. **Браўковіч** (Ворша), **Сычоў** (Полацак), якія з 50 магчымых выбілі 47 ачкоў, **Мікуліна** (Бабруйск), **Лапідус** (Менск), **Мілееў** (Віцебск), якія далі 46 ачкоў з 50 магчымых.

Па кіданьні гранат — першае месца — **Магілеў,** другое — **Ворша,** трэцяе— **Бабруйск.** Лепшыя рэзультаты далі т. т. **Войтэнік** (Полацак), **Егіроўскі** (Слуцак).

ПРЭМІІ — ЛЕПШЫМ

Пасьля абвяшчэньня рэзультатаў спаборніцтва лепшым камандам-пераможцам былі прысуджаны прэміі. Калектыў **Менску** атрымаў **першую прэмію імя ЦВК БССР — Чырвоны Сьцяг.**

Другую прэмію — бюст тав. **Сталіна** — атрымаў калектыў **Віцебску,** трэцюю — грамату ВСФКБ — **калектыў Гомелю.** Асобныя каманды, заняўшыя першае месца па некаторых відах спорту, атрымліваюць дыплём ВСФК.

Прэміі будуць раздаены 12 чэрвеня ў дзень адкрыцьця ўрачыстага пленуму, прысьвечанага юбілею фізкультурнай арганізацыі БССР.

ЗБОРНЫ КАЛЕКТЫЎ АД БССР НА УСЕСАЮЗНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПА ЦЯЖКАЙ АТЛЕТЫЦЫ І ГІМНАСТЫЦЫ

У рэзультаце ўсебеларускіх спаборніцтваў лепшыя фізкультурнікі, якія заваявалі першынства ў розных відах спорту, адабраны ў зборны калектыў ад БССР для ўдзелу ва ўсесаюзных спаборніцтвах па цяжкай атлетыцы і гімнастыцы.

У складзе зборнага калектыву ўваходзяць т. т. ІОСЕЛЕВІЧ І., МАЙЗЭЛЬС, ЛЮЛЯКОЎ, СТУЛЬКЕВІЧ, МІРСКІ, МУРАВІЦКІ, РУБІН, БЛОНШТЭЙН (барцы), ЛАПІДУС, ІОСЕЛЕВІЧ Г., ВАЙНІЛОВІЧ, САМКОВІЧ, МАСАЛОВІЧ, МІЛЕЕЎ (гіраўкі), СУХАРУКАЎ, ПАЛТЫН, ПАНАСЮК, ЛУКШЫЦ І АМБРОСІМАЎ (баксёры). Прадстаўнікамі ад калектыву БССР выпучаны т. т. КРАВЕРСКІ і ПЕСТРЫКАЎ.

Усяго калектыў удзельнікаў усесаюзных спаборніцтваў ад фізкультурнай арганізацыі БССР складаецца з 21 чалавека.

ПА ШПАЛЬТАХ газет СССР

ГОРАД У ЛЯСНОЙ ГЛУШЫ

У лясной глушы Паўночнага Ураду, у 200 кілёмэтрах ад станцыі чыгункі вырас новы горад—Краснавішарск. Краснавішарск—горад паперы, дзе за 15 месяцаў пабудован гіганцкі камбінат, абсталявана ўзорная лясная біржа з механізаванай падачай лесу, пабудавана магутная парасілавая ўстаноўка, цэлюлёзны завод і інш. Амаль на 3 кілёмэтры ўздоўж пясчаных берагоў Вішары раскінуўся рабочы горад з 30.000 насельніцтвам. Пабудаваны гасьцініцы, тэатр, клюбы, праведзен водапровод, будуецца каналізацыя. Кожны дзень параходы нагружаюцца сотнямі тон першагатунковай паперы. **(«Уральский рабочий»).**

НОВЫ ГІГАНТ МАГНІТАГОРСКУ

«Гипроруда» скончыла тэхнічны праект вялізарнай магнітагорскай капальні. У 1937 годзе капальня павінна даць 7,5 млн. тон руды. На бураных работах будуць адначасова працаваць 37 варштатаў. На абатачальную фабрыку руда будзе дастаўляцца магутнымі электравозамі. У вагоны яна будзе пагружацца з аўтаматычных чарпакоў, ёмістасьцю ў 23 кбм. Чыгуначныя шляхі капальні павінны прапускаць па 63 пары паездоў у дзень **(«Красная газета»).**

САВЕЦКІЯ ГАРАДЫ—НА МІЖНАРОДНАЙ ВЫСТАЎЦЫ

Восеньню гэтага году ў Парыжы адкрываецца выстаўка гарадоў і гарадзкой гаспадаркі. У выстаўцы прымуць удзел 1 гарады СССР. З Саюзных рэспублік на выстаўцы будуць прадстаўлены Закаўказьве і Украіна. Украіна пакажа на выстаўцы сваю сталіцу—Харкаў, які вырас за час рэвалюцыі амаль у тры разы, 1 ў корані зьмяніў свой твар, а таксама новы горад Гардоўку, вырасшы на месцы невялікага пасёлку, і Вялікае Запарожжа, як тып сацыялістычнага гораду.

У савецкім павільёне на выстаўцы рабочыя капіталістычных краін убачаць, як у Савецкім саюзе з маленькіх глухіх гарадоў вырастаюць новыя сацыялістычныя гарады, дзе створаны ўсе ўмовы дабрабыту і гігіены **(«Вечерняя Москва»).**

НОВЫ ПАХОД У АРКТЫКУ

Новым буйнейшым этапам у асваеньні Арктыкі зьяўляецца ў гэтым годзе паход ледаколаў «Красіна» і «Чалюскіна» праз Ледавы акіян. Дашоўшы да вострава Врангеля, ледаколы павінны зьвярнуцца ў Мурманск тым-жа шляхам. Адна з мэт паходу зьмяніць зімоўшчыкаў вострава Врангеля і завесьці туды новае абсталяваньне. **(«Правда Севера»).**

Ударнікі Лок-Батана гераічна змагаюцца, каб ня даць марна загінуць фантаноючай нафце.

НА ЗДЫМКУ: ударнік Лівашэнаў пракладвае лінію ў сьвіран. На заднім пляне фантануючая буравая № 45.

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС ССТ

ПЕРАНЕСЬЦІ НА ПОЛІВА І УБОРКУ ВЫПРАБАВАНЫЯ МЭТАДЫ БАРАЦЬБЫ ЗА СЯЎБУ

У ДНІ, КАЛІ ВЫРАШАЕЦЦА ЛЁС УРАДЖАЮ...

Два факты акрэсьліваюць палітычны твар Сераднякоўскага сельспажыўтаварыства.

За першыя чатыры месяцы мінулага году ім было прадана тавараў на 59 тыс. руб.; за гэты-ж пэрыяд бягучага году — на 160 тыс. руб. **Амаль у тры разы больш!**

Веснавую сяўбу ў 1932 годзе Сераднякоўскі сельсавет скончыў толькі ў другой палове чэрвеня. У гэтым была і доля віны каапэрацыі, якая слаба ўвязала сваю гаспадлёвую работу з вытворчымі задачамі калгаснага земляробства.

Веснавую сяўбу 1933 году сельсавет скончыў 14 мая — на месяц раней летапняга. У гэтым, паводле адпадушных водгукаў мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый, брыгадзіраў і радавых калгаснікаў, — у вялікай меры заслуга сельспажыўтаварыства.

Дыфэрэнцыяваным тавараснабжэньнем сельспажыўтаварыства прымусіла падцягнуцца пасасобныя адсталыя калгасы. Калі калгас імя Сталіна затармозіў сяўбу, крама, якая яго абслугоўвае, не атрымала лепшых дэфіцытных тавараў.

Сераднякоўскае ССТ ня ведала і ня ведае недахвату солі, тутуну, запалак, яно заўсёды мае такія тавары, якія ў іншых спажывецкіх таварыствах лічацца дэфіцытнымі. Сераднякоўская каапэрацыя набывае прадукцыю добрай якасьці і патрэбнага асартымэнту, тому яна ня ведае затаварваньня і працуе з прыбыткам. Плян таваразвароту першага кварталу выканан на 181 проц. За красавік і май ССТ перавыканала плян таваразвароту другога кварталу. Першыя чатыры месяцы бягучага году далі 5.000 руб. чыстага прыбытку. Крывая накладных выдаткаў зьніжаецца: выдаткі звароту даведзены да 2,4 проц. замест 4,1 проц. паводле пляну.

Гэтыя добрыя паказальнікі паслужылі падставай для прэміяваньня Сераднякоўскага ССТ на ўсебеларускім конкурсе сельспажыўтаварыстваў.

У барацьбе за ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі, каб зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі, сельспажыўтаварыства займае перадавыя пазыцыі. Практыка работы па абслугоўваньні сяўбы паказала, што мэтады работы ССТ у гэтай галіне правільныя і эфэктыўныя. Пераключыўшыся на абслугоўваньне поліва, Сераднякоўская каапэрацыя пачала ўжываць выпрабаваныя формы работы, замацавала і пашырыла дасягнутыя на сяўбе посьпехі.

У пачатку трэцяй дэкады мая старшыня спажывецкага таварыства тав. **Кіявіцкі** мабілізаваў сваіх работнікаў прылаўку на барацьбу з пустазельлем.

Тав. **Хатэнка** — прадавец крамы, якая абслугоўвае **калгас імя Сталіна,** заключыў дагавары з чатырма брыгадамі. Калгаснікі абавязаліся да 1 чэрвеня скончыць поліва пшаніцы і пачаць першае баранаваньне бульбы. Брыгады выканалі дагавор.

Брыгады № 3 і 4, якімі кіруюць т. т. **Апановіч** і **Казёл,** да тэрміну (29 мая) скончылі поліва сваіх вучасткаў пшаніцы (6 га) і пераключыліся на дапамогу адсталым. Дзякуючы гэтай дапамозе да 31 мая выканалі свае абавязацельствы па поліву 13 га пшаніцы і брыгады № 1 і 2. Брыгада № 4 да 30 мая прабаранавала 10 га — палову свайго вучастку бульбы.

Прадавец Хатэнка большую частку часу праводзіць у полі сярод калгаснікаў і калгасьніц. Ён сумяшчае дзьве функцыі: абавязкі каапэрацыйнага прадаўца і кантралёра. Ён цесна ўвязвае продаж дэфіцытных тавараў з якасьцю і колькасьцю працы, якую сам правярае. Дзякуючы каапэрацыйнаму кантролю ўдалося скарыстаць нават пустазельле. **Брыгады, якія падпісалі дагавары, акуратна зьбіралі зельле і пасьля абрэзкі карэньняў адпраўлялі сьвежую зялёную масу на корм жывёле.**

Праверка, праведзеная казпактывам, паказала, што калгас імя Сталіна добра выконвае свае абавязацельствы па падрыхтоўцы да ўборкі. Яшчэ 30 мая былі вылучаны і пастаўлены па адначынак першыя тры пары коняй, вызначаныя для цяжкіх уборачных работ (жніво, касьба). Праверены, ачышчаны і змазаны жня вяркі і сенакасарка. Гатовы да выезду ў поле 10 фургонаў і 41 аднаконных фурманак. На калгасным складзе падрыхтаваны збруя, вяроўкі і інш. гаспадарчыя прылады.

Сельспажыўтаварыства выканала свае абавязацельствы па развозным гандлі, па абслугоўваньні калгаснікаў і калгасьніц непасрэдна ў полі. Паколькі калгасьніца вырашае посьпех поліва, каапэрацыя аддае ёй максымум увагі. Таму сярод завезеных тавараў шмат такіх, на якія попыт прад'яўляе, галоўным чынам, жанчына: жаночая вопратка, мыла, бялізна, лёгкая мануфактура, жаночы абутак і інш.

Да 1 чэрвеня Сераднякоўскі сельсавет скончыў поліва пшаніцы на плошчы ў 514 га. Калгасы прыступілі да баранаваньня бульбы. Пачалі ўзмоцнена рыхтавацца да ўборкі: 32 коні пастаўлены на адначынак, агледжаны ўсе ўборачныя машыны і інвэнтар; 19 жнівярак і сенакасарак гатовы да выхаду ў поле, 5 касарак і жнівярак пастаўлены на рамонт.

Гэтыя посьпехі на вучастку поліва (у мінулым годзе поліва пачалося толькі ў трэцяй дэкадзе чэрвеня) — у значнай меры вынік баявой работы каапэрацыі, паказаны намі на практыцы работы прадаўца Хатэнка. Дыфэрэнцыяванае тавараснабжэньне плюс штодзённы кантроль каапэрацыі над выкананьнем заключаных брыгадамі дагавароў — вось два мерапрыемствы, якія далі вялізарны эфэкт.

В. Л.

Вал. Мядзьведзеў.

«ЗДАНЬ БЛУКАЕ ПА ЗЎРОПЕ».

З камісіі па раззбраеньні

Чарговая япона-амэрыканская перапалка

ЖНЭВА, 8 (Белта). 7-га чэрвеня генэральная камісія закончыла першае чытаньне ангельскага праекту. Пасьля спрэчак аб абмежаваньні ваенных бюджэтаў прынята рэзалюцыя, якая даручае **Гендэрсону** весьці перагаворы з дэлегацыямі па гэтым пытаньні. Камітэт-жа па ваенных бюджэтах павінен працягваць распрацоўку пытаньня. Затым прынята прапанова бюро канфэрэнцыі прыняць ангельскі праект у якасьці асновы канвэнцыі.

Закончыўшы першае чытаньне праекту, камісія павінна была разьйсьціся, аднак к гэтаму моманту японскі дэлегат **Сато** прыстасаваў сваё чарговае выступленьне супроць ПАЗШ.

Сато заявіў, што Японія зможа згадзіцца на забарону паветранай бамбардыроўкі толькі пры ўмове забароны і скасаваньня авіяносцаў, забароны спабжаць ваенныя судны пляц-формамі для пасадкі аэраплана, а так сама, калі будзе заключана згода не скарыстоўваць грамадзянскай авіяцыі для ваенных мэтаў у ваенны час. Сато сьцьвярджаў, што Японія выстаўляе гэтыя ўмовы таму, што ня мае вялікага грамадзянскага флёту і паражальная ў выпадку паветраных нападаў, асабліва самалётаў, якія выпускаюцца з авіяносцаў і маюць вялікі радыус дзеяньня.

Крытыкуючы лёндансікі морскі дагавор, які не зьмяшчае абмежаваньняў у адносінах авіяносцаў, Сато падкрэсьліў, што дагавор ня даў заспакаеньня, а стварыў непакой.

Пасьля выступленьня Сато, **Гендэрсон** заявіў, што сёньня-ж адбудзецца яшчэ адно пасяджэньне камісіі, на якім чакаецца амэрыканскі адказ на прамову Сато.

Франка-англа-амэрыканскія перагаворы аб раззбраеньні

ПАРЫЖ, 8 (Белта). Сёньня ўвесь дзень вяліся франка-англа-амэрыканскія перагаворы аб раззбраеньні. Ад ПАЗШ у перагаворах прымаў удзел **Дэвіс,** ад Англіі—**Ідэн** і **Лендандэры,** ад Францыі **Даляд'е, Бонкур і Лейг.** Афіцыяльнае паведамленьне абмяжоўваецца ўказаньнем, што абмяркоўвалася становішча, створанае на канфэрэнцыі па раззбраеньні.

Канфлікт паміж Японіяй і Англіяй

Японскія фабрыканты патрабуюць увядзеньня байкоту Індыйскіх тавараў

ТОКІЁ, 8 (Белта). Урадавыя колы і тэкстыльныя фабрыканты аддаюць шмат увагі пытаньню аб новым павышэньні мытных тарыфаў у Індыі. Лічаць бясспрэчным, што прапанаваная ангельскім міністрам гандлю **Рэнсімэнам** канфэрэнцыя прадстаўнікоў ангельскіх і японскіх гандлёвых колаў сарвана.

Тэкстыльныя фабрыканты патрабуюць ужываньня рэпрэсыўных мер, у прыватнасьці **байкоту індыйскай бавоўны і павышэньня мытных зборaў на жалеза, якое ўвозіцца з Індыі.** Павышэньне мытных тарыфаў у Індыі расцэньваецца ў Японіі, як мера забарончага парадку, тым больш, што з прычыны ранейшых мер індыйскага ўраду экспарт японскіх тэкстыльных вырабаў у Індыю і без таго за апошні час значна скараціўся.

Сёньня на такійскай біржы зноў упалі каштоўныя паперы ў сярэднім на 8 пунктаў. Найбольш рэзка ўпалі акцыі тэкстыльных кампаній.

***

ТОКІЁ, 9 (Белта). Паводле апошніх паведамленьняў выканком саюзу фабрыкантаў японскай прадзільнай прамысловасьці пастанавіў **абвясьціць байкот індыйскай бавоўны.** Саюз кантралюе 99 проц. прадпрыемстваў прадзільнай прамысловасьці Японіі. Прадстаўнік міністэрства замежных спраў указаў, што японскі ўрад ня мае намеру караць арганізацыі і асобы, якія праводзяць байкот.

«Ніці-ніці» і «Коку-мін» падкрэсьліваюць, што **паміж Англіяй і Японіяй пачынаецца эканамічная вайна,** якая, несумненна, будзе суправаджацца палітычнымі ўскладненьнямі. 9-га на біржы працягвалася падаўленае курсу акцый тэкстыльных прадпрыемстваў.

Польшча незадаволена пактам чатырох

ВАРШАВА, 9 (Белта). Як паведамляе польскае агенцтва, міністар замежных спраў **Бэк** заявіў, што ніякае палажэньне, прынятае на аснове пакту 4-х, якое проста ці ўскосна закрапала-б Польшчу, ня будзе абавязковым для польскага ўраду. Увядзенне ў сілу пакту выкліча арганізацыны крызіс Лігі нацый. Пастановы Савету лігі і яго органаў могуць мець абавязковую сілу толькі ў выпадку дакладнага выкананьня літары і духу статуту Лігі.

Волгукі Італьянскага друку на парафіраваньне пакту

РЫМ, 8 (Белта). Увесь друк сьцьвярджае, што пакт 4-х адкрывае шлях для заключэньня двухбаковай франка-італьянскай згоды.

«Джорнале д'Італія» прабуе даказаць, што для Германіі парафіраванне пакту адзначае «дыпляматычны посьпех», і што яна нібы-та «ва ўмовах поўнай роўнасьці ўступае ў канцэрн кіруючых дзяржаў Эўропы і пазбавілася небясьпекі ізаляцыі». Газета адзначае далей, што пакт 4-х ня выходзіць за рамкі статуту Лігі нацый, і сьцьвярджае, што ён не навіроваи супроць трэціх краін, у прыватнасьці, не накіроваи супроць ПАЗШ.

Выбух японскай базы цяжкіх бамбавозаў

ТОКІЁ, 8. (БЕЛТА). На тэрыторыі базы адзінага ў Японіі авіяпалка цяжкіх бамбавозаў у **ХАМАМАЦЫ** 7-га чэрвеня адбыўся сэрыя выбухаў. Да гэтага часу прецягвацца выкліканы выбухамі пажар. Разбураны 3 ангары і каля 50 самалётаў. Зьнішчаны 3 бомбасховы, 3 бензынасховы, будынкі і лябараторыі заводу па вырабе авіябомбаў, шмат грамадзянскіх пабудаваньняў, будынак пошты, чыгуначная станцыя. Раён вчэп.лон войскамі.

Паводле вестак газэт, выбух адбыўся з прычыны надбайнага абыходжаньня з бомбамі пры перавозцы іх з адной сховы ў другую. Паводле папярэдніх даных, загінула двое, цяжка паранена больш за 10 чалавек. Адносна невялікі пін агня тлумачыцца тым, што выбух адбыўся ноччу. Сіла выбуху была настолькі вялікая, што ва ўсіх домах у раёне разьмяшчэньня авіяпалка выбіты вокны і спынілася насьценная гадзіньнікі. Д... ад пажару быў відзен за 60 міль.

З. Бядуля і Крапіва

НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЕХ ЛЕПЕЛЬШЧЫНЫ*)

Усьлед за Шасьціткам, наступаючы яму на пяты, ідзе з сваёй брыгадай тав. Даятлаў. У мінулым годзе гэта брыгада была прэміявана за лепшае правядзеньне сяўбы і ўборкі, і ў гэным годзе ўтрыманьне за сабою пярэдняга зьяўляецца справай гонару як усяе брыгады цалкам, так і брыгадзіра Даятлава асабліва. Вось чаму тав. Даятлаў так прагна прыпадае да дыяграмы, дзе паказан процант выкананьня пляну сяўбы па брыгадах. Адразу кідае вокам на самы вышэйшы слупок дыяграмы:

— Ох чорт! На гры процанты ўперадзе, — кажа ён зайздросна. — Даждзны мяне прысадзілі, зямля ніжая, а так ня пусьціў бы я Шасьціцку наперад.

— Нічога, мы яшчэ надзіснем, нідзе ён ад нас ня дзенецца, — упэўнена заўважае Ханяк Рытор, лепшы работнік у брыгадзе в. Даятлава.

— Слабо ўжо мусіць дагнаць вам Шасьціцку, — сумняваецца старшыня калгасу.

— Чаму слабо? Нічога не слабо, — гарачыцца Даятлаў. — Канавы капаць у мяне сёньня канчаюць, зямля падсохла, коні пашлі на пашу — сталі лепш цягнуць: быць ня можа, каб мы Шасьціцку не ўзабралі! — І разадранае крысо жоўтай сьпіжкі Даятлава энэргічна матлянула ў такт яго рухаў. Пра людзей сваёй брыгады Даятлаў нават і не гаворыць: яму здаецца, што бяды настрой яго брыгады і так усім відомы.

Ды тут-жа і самі яны — самы цьвет брыгады — адзін перад адным сьцьвярджаць заяўце пра сваю гатоўнасьць змагацца за пярэдняга. Паводле настрою калгаснікаў, паводле расстаноўкі сіл гэта брыгада можа заняць першае месца ў калгасе, і разьвітаючыся, мы таксама гатовы сказаць разам з брыгадзірам Даятлавым:

— Дзяржыся, тав. Шасьціцка!

Першай да залу ў змаганьні за ўрадзай ідзе брыгада № 8 на чале з брыгадзірам Гатоўкай. Калі з брыгадзіра Даятлава трапляеш у брыгаду Гатоўкі, дык адчуваецца вялікая розьніца. Людзі, праўда, і тут працуюць напружана, але непаладак у рабоце куды больш, упэўненасьці ў сваіх сілах значна менш, настрой далёка не такі бяды, а часамі можна пачуць і дакананьне. Сам брыгадзір Гатоўка гаворыць з вамі так, быццам ён у вас прабачэньня просіць за штосьці. І зразу зьяўляецца думка: а ці не вінават ён і сапраўды ў чым-небудзь?

Брыгадзіра Гатоўку знайшлі мы на полі, дзе ён з часткай сваёй брыгады садзіў бульбу.

— Колькі-ж усяго ў вас бульбы пасаджана ўжо?

— Вось, як скончу гэты кавалак, будзе два з паловай га.

— Здаецца-ж ў вестках на ўчарашні дзень у вас было ўжо 2½ га бульбы?

— А, гэта, бачыце, даючы весткі праўленьню заўчора, я залічыў і гэтыя 2½ га, якія па пляне павінен быў пасадзіць учора, але не пасьпелі і вось сёньня канчаем.

Што гэта «очковтирательство», даводзіць нам доўга ня прыходзіцца. Гатоўка і сам гэта ведае, але, бачыце, так даваць весткі вучыў яго «таварыш» Бэрман. Бэрман — гэта былы рахункавод калгасу «Чырвоны сьцяг», у мінулым гандляр, ліпэнец, фігура па-свойму досыць «выдатная». І вось «мудрую» інструкцыю Бэрмана — даючы весткі, лічыць зробленым сёньня тое, што думаеш рабіць заўтра, — брыгадзір Гатоўка засвоіў мацней за ўсіх іншых брыгадзіраў калгасу: усё-ж такі процант выкананьня будзе трошкі «большы» і ня так сорамна будзе перад другімі брыгадамі.

Прычыны адставаньня брыгады Гатоўка тлумачыць тым, што на полі гразка, узьехаць нельга, ды коні ня цягнуць. Але на полі ў Гатоўкі сушэй, як у Даятлава, а коні не слабейшыя, як у Шасьціткі. Абмуленых коняй, праўда, больш відаць. Пытаемся:

—Колькі-ж у брыгадзе ўсіх коняй абмуленых?

Гатоўка лічыць на пальцах. Калгаснікі яму памагаюць.

— Пяцёра.

— Як ім не абмульваецца! — філёзофствуе пажылы дзядзька. — Косткі гэтыя тырчаць, хамут ня прыстае. Пахадзіў дзень у баране, дык і гатоў.

Ніхто за абмуленых коняй спачуваньня не паўдзе, вінаватага няма, вінаваты самі коні, што худыя. А тым часам ёсьць брыгады, дзе няма ніводнага абмуленага каня.

Коняк Брашоў Ігнат ў брыгадзе Гатоўкі лічыцца «адказным» коняком. Нас трохі дзівіць такая тэрміналёгія. Калі ёсьць «адказны», дык павінна ёсьць і неадказныя. Пачынаем уваходзіць у сутнасьць справы і выяўляецца, што сапраўды ёсьць такія. — Гэта — Ульяна Пузан і Ганна Пузан.

— Колькі вы коняй даглядаеце? — пытаемся ў Брашова.

— Трыццаць.

— А цётка Ульяна?

— Ну і я-ж трыццаць.

— А Ганна Пузан?

— Яна таксама трыццаць.

— Дык у вашай брыгадзе усіх 90 коняй?

Ульяне нават сьмешна стала ад такога наіўнага запытаньня нашага.

Калгаснікі нам гут-жа растлумачылі, што галоўны конюх, — гэта Брашоў. Пузаны яму толькі памагаюць. А, каб конюхі дзялілі коняй паміж сабой — у іх гэтага няма.

— Ну, а калі вось гэты сівы конь, праз недатляд конюхаў скалечыцца ў стайні, хто за яго будзе адказваць?

— Няхай нас бог крые і ратуе ад такой напасьці! Ніколі ў нас гэтага не здаралася, — «пераканаўча» адказвае Ульяна Пузан, зложыўшы рукі на жывоце.

Стараемся давесьці, што з богам конюх — нікуды ня варты, і дзе яму даручаюць наглядаць за коньмі, так яко-раз і здараецца няшчасьце; што за каня павінен адказваць усё-ж такі конюх.

— Яна мусіць бы хацела, каб я адказваў, — гаворыць, нарэшце, Брашоў, недаверліва паглядаючы на Ульяну Пузан.

Ні нормы, свае, ні колькасьці і заробленых працадзён конюхі ня ведаюць, — усё гэта ведае брыгадзір. А брыгадзір тлумачыць ня так ясна, як коратка.

— Адказнаму прыдзецца што-небудзь накінуць, а гэтым дзьвюм запішаца па-роўну.

— А ў вас шмат працадзён за гэты месяц? — пытаемся ў калгаснікаў-пачынаючых рабочага.

— Адкуль-жа я ведаю.

— Як адкуль! У вашай-жа працоўнай кніжцы запісана.

— Нашы кніжкі ўсе ў брыгадзіра, зьвісёны ў яго. Мы яму верым.

Наўзабаве выявілася, што ў працоўных кніжках працадні не занесены яшчэ за красавік месяц, хоць было ўжо 17-е мая.

Пакідаючы брыгаду Гатоўкі, мы лішні раз пераконваемся ў тым, што «абэктыўныя ўмовы» часта стварацоць самі людзі, і што выбар брыгадзіра ў калгасе зьяўляецца надзвычайна важнаю справаю.

Ва ўсіх іншых брыгадах калгасу «Чырвоны сьцяг» працоўныя кніжкі, як правіла, таксама знаходзяцца ў брыгадзіра. Працадні ў кніжкі запісваюцца раз у месяц, гады калгаснік і можа даведацца, колькі працадзён ён запрацаваў. Некаторыя калгаснікі, праўда, прабуюць заводзіць сваю ўласную «бухгальтэрыю»: ставяць палачкі вугальчыкам на вушаку, каб ведаць, колькі выхадаў на работу было ў яго за месяц, і хоць гэтым пракантраляваць запіс брыгадзіра ў табель. Большасьць-жа калгаснікаў проста здаюцца на сумленнасьць брыгадзіра: «Што яму за карысьць нас ашукаць».

Ня ўсе брыгадзіры і не заўсёды гавораць калгаснікам, колькі ён зрабіў за дзень. Таму і ня дзіва, што індывідуальнае спаборніцтво, як мэтад, у калгасе не практыкуецца. На запытаньне, хто зьяўляецца ў брыгадзе лепшымі ўдарнікамі, часта можна пачуць адказ:

— Ды няма чаго богу грашыць, — усе добра працуем.

Вакол ударнікаў належнай масавай працы не вядзецца. Калі ў брыгадзе насьценная газэта часамі і пералічваецца імёны лепшых калгаснікаў, дык ніколі ня пішацца пра тое, як яны выконваюць норму выпрацоўкі.

Усе гэтыя недахопы, бясспрэчна, ня могуць не адбіцца на тэмпах, а часамі і на якасьці сяўбы.

Мы сёньня ў калгасе «Чырвоны сьцяг» — апошні дзень. Падсумоўваем тое, што чулі і бачылі за гэтыя некалькі дзён. Надлічваем плюсы і мінусы, каб мець аб калгасе поўнае ўяўленьне. Нам, для паўнаты малюнка, хочацца яшчэ мець хоць кавалачак гісторыі: як нарадзіўся і рос калгас «Чырвоны сьцяг» і якія цяжкасьці ён пераадолеў на сваім шляху? У час абедзенага перапынку ловім г. Качана. Ён у калгасе ад самага пачатку яго заснаваньня і добра памятае, калі калгас быў яшчэ ў пялёнках і налічваў у сваім складзе ўсяго 7 гаспадарак.

Сам Качан сельска-гаспадарчую школу пачаў праходзіць з дзесяцігадовага ўзросту, калі ён пашоў у пастушкі да кулака Нічышара Краслі ў вёсцы Другія Мялені. Пасьля служыў парабкам у іншых кулакоў і год працаваў на цагельным заводзе ў Мітаве, год — на вугальных шахтах Харкаўшчыны. Калі Казан вырас і стаў дужым дзяцюком, тады убачыў яго і цар «бацюшка», і пашоў Качан на фронт абараняць «бацькаўшчыну». Вярнуўся з вайны інвалідам. Цяпер тав. Качан — член партыі. З 1929 г. зьяўляецца старшынёй калгасу і аддае ўсе свае сілы на яго ўмацаваньне.

Цяжка было першым сем'ям, былым парабкам, якія ў 1921 годзе на былой панскай зямлі ў Губіне заснавалі сельска-гаспадарчую арцель. Ня было кватэр і некалькі тыдняў начавалі на дварэ пад асеньнімі дажджамі. Мясьціліся зімою па тры сем'і ў адной халупіне. Летам, пасьля цяжкай працы на полі, прыходзілася начаць вартаваць пасевы, якія кулакі траілі сваімі коньмі. Не абышлося ў свой час і без галавакружэньня ад посьпехаў, пасьля чаго пачаўся адліў, стараючы пагрозу самому існаваньню калгасу.

Але цяпер калгас ужо моцна стаў на ногі, ачысьціўся ад варожых элементаў, налічвае ў сваім складзе 247 гаспадарак. Абагуленае стада — 202 штукі коняй — 256. Калгас мае 68 вульляў пчол, пасадзіў 15 га саду. Шырока разгорнута будаўніцтва: стайні, ільнасушня, малочная, сьвінарнік. Усе загатоўкі калгасам выкананы больш як на 100 проц. Насеньнем калгас забясьпечыў сябе цалкам ды яшчэ калгасу «Батрак» пазычыў 10 цэнтнэраў ячменю.

Тав. Качан нецярпліва паглядае ў вакно і мы не адважваемся больш яго затрымліваць. Там, за важном, адбываецца сёньня нешта ня зусім звычайн

ЧЫСТКА МЕНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Дабіцца рашаючых зрухаў у выкананьні прамфінпляну, ва ўмацаваньні партыйнай дысцыпліны і паляпшэньні выхаваўчай работы

Парткалектыў заводу імя Мясьнікова сустрэў чыстку партыі непадрыхтаваным

«Зьвязда» пісала ўжо аб тым, што 5 чэрвеня сход па чыстцы партарганізацыі Менскага дэпо сарваўся. Прычыны гэтаму — абсалютна безадказныя адносіны да важнейшай партыйнай справы з боку сакратароў парткалектываў цягі тав. **Шота** і заводу імя Мясьнікова **Шлеміна**, а таксама загадчыка чыгуначнага клюбу тав. **Якімава**.

Першы сход па чыстцы камуністаў чыгункі адбыўся 7 чэрвеня. Сход адкрыў старшыня праверкому тав. **Ліскові**ч.

З вялікай увагай быў заслуханы рабочымі яго даклад аб задачах надыходзячай чысткі партыйных радоў.

Даклад аб становішчы партработы на заводзе зрабіў сакратар парткому тав. Шлемін. Завод доўгі час ня выходзіць з паласы прарыву. Са студзеня 1933 году выкананьне прамфінпляну не перавышае 90 проц. У маі мы маем зьніжэньне да 83 проц. Адстае пасажырскі цэх. Ён асвоіў майскае заданьне ўсяго на 68 проц.

Парткалектыў і цэхавыя ячэйкі аддавалі мала ўвагі выкананьню прамфінпляну. Асобныя цэхавыя арганізацыі займаліся «очковтирательством». Пасажырскі цэх, напрыклад, за сакавік адрамантаваў 20 вагонаў, даны-ж весткі, што адрамантавана 30. У выніку рамонт 10 вагонаў зацягнуўся аж да 17 красавіка і толькі пасьля гэтага цэх прыступіў да выкананьня красавіцкай праграмы.

Яшчэ горшы малюнак з якасьцю прадукцыі. Вагоны часта не даходзяць да месца прызначэньня. Дрэнна рамантуюцца і вагоны транссібірскага сьледваньня. Гэтымі днямі завод атрымаў тэлеграму ад НКПЗ, што з адрамантаванага заводам саставу транссібірскага цягніка 5 вагонаў прышлося затрымаць у Маскве і паставіць на паўторны рамонт. Адзін зусім выведзен са строю. Дрэнная якасьць прадукцыі значна павысіла сабекошт. Рамонт таварнага вагона замест 350—400 руб. каштуе 800 руб., пасажырскага — 4.000 руб. замест 2.500 руб.

Партыйная арганізацыя не вяла жорсткай барацьбы з бракаробамі. Сакратар парт'ячэйкі — прыёмчык **Агееў** прымае прадукцыю дрэннай якасьці.

Нізкая партдысцыпліна. З 24 партыйных груп да апошняга часу не працавала ні адна. Толькі нядаўна распачалі працу 11 груп (Сінько, Сагіна, Гайдукова і інш.). Са 178 камуністаў ахоплены партвучобай толькі 104. На заняткі партшкол замест 25 чалавек зьяўляецца толькі 6-7. 11 камуністаў на працягу году, а некаторыя і па два гады, ня плацяць партыйных узносаў.

Прытуленьне клясавай пільнасьці ў асобных камуністаў прывяло да таго, што партарганізацыя заводу трымала на пасадзе сакратара цэхавай ячэйкі і начальніка інструментальнага цэху «камуніста», былога дзяніка контр-рэвалюцыйнай групы — **Шаблоўскага**. Гэта група сьвядома псавала маторы, дэфіцытныя матар'ялы вагоны, выводзіла са строю варштаты. Толькі нядаўна гэта група выяўлена і прыцягнута да адказнасьці.

Прыкладна такога-ж зьместу быў даклад сакратара парт'ячэйкі пасажырскага цэху.

Разгорнуты аналіз становішча партыйнай работы і прычын адставаньня заводу далі 18 рабочых, якія выказаліся ў спрэчках па дакладу.

— Мы шмат крычалі аб прарыве, але ня здолелі вывучыць канкрэтных прычын і мабілізаваць масы на ліквідацыю адставаньня. Каваль **Зуркоў** увесь час даваў на вачох камуністаў брак, а яны не прынялі канкрэтных мер, — так заявіў рабочы тав. **Барашка**.

—Нельга чакаць ад парторгаў добрай партыйна-масавай работы, раз яны ня ведаюць камуністаў сваёй партгрупы, — адзначыў выступаючы тав. **Драздоў**.

Тав. **Гурэвіч** завастрыў увагу сходу на зрыве партвучобы. Парткалектыў выпусьціў гэта важнейшае мерапрыемстве з-пад увагі, ня прымаў мер да зрыўшчыкаў вучобы.

— Работа сярод жанчын — вузкае месца на заводзе. Віна, таварышы, наша — камуністаў (выступл. тав. **Белякоўскага**).

«Камуніст» Васільлеў (мацнёр цэху) спэкулюе прадуктамі на рынку. «Камуніст» Фалькоўскі лічыць больш выгадным пагуляць у карты, чым ісьці на партыйны сход. На апошніх ён амаль ніколі ня бывае. Кандыдат партыі Гасмаркевіч сыстэматычна зьяўляецца на працу п'яным. Кандыдат КП(б)Б Прышчэпкін адмовіўся ад падпіскі на пазыку імя 2-й пяцігодкі. Сярод асобных камуністаў панує настрой: выключаць з партыі — некалькі лішніх рублёў застанецца ў кішэні (выст. т. т. **Барашка, Рамашэўскага, Субоціна**).

— Кіраўніцтва работай заводу габінэтнае. Дырэктар мала бывае ў цэхах і не аказвае належнай дапамогі ў рабоце начальнікам цэхаў. Работа ў цэхах не арганізавана. Некаторыя цэхі ня маюць абгрунтаванай праграмы і расцэнак на выраб розных дэталяй (таварны цэх). Амаль адсутнічае на заводзе тэхнічнае кіраўніцтва і вучоба па павышэньні кваліфікацыі рабочых (выст. т. **Зусмановіча, Елісеева, Федарчука**.

З усіх гэтых выступленьняў асабліва ясна, што партыйны калектыў заводу імя Мясьнікова сустрэў чыстку непадрыхтавана. Падрыхтоўка да чысткі ня была ператворана ў масавы паход за ўзьнішчэньне ўсёй партыйнай работы. У часе падрыхтоўкі не палепшылася партыйна-масавая работа, не палепшылася партыйная дысцыпліна, не ўзьнялася авангардная роля камуністаў на вытворчасьці. Тое, што было ўпушчана да чысткі, трэба навярстаць зараз. Чэрвень месяц павінен стаць пераломным у сэнсе карэннага павароту камуністаў Менскага дэпо тварам да вытворчасьці, у сэнсе павышэньня іх палітычнага ўзроўню

Н. Ф.

Аб зрыве сходу па чыстцы партыі ў ячэйцы паравознага дэпо

Пастанова сакратарыяту Менгаркому КП(б)Б ад 8-VI 1933 г.

Заслухаўшы тлумачэньне сакратароў парткалектываў чыгуначнага вузла — т. т. **Шота і Бурдо** аб зрыве сходу па чыстцы партыі ў ячэйцы паравознага дэпо, у выніку неарганізацыі яўкі ня толькі беспартыйных рабочых, але нават і камуністаў (на чыстку зьявілася ня больш 40 проц. членаў і кандыдатаў партыі), сакратарыят ГК КП(б)Б кваліфікуе гэта, як апартуністычную недаацэнку партыйным кіраўніцтвам чыгуначнага вузла палітычнага значэньня чысткі, прытуленьне палітычнай пільнасьці і поўную безадказнасьць як з боку парткалектываў, так і членаў партыі да выкананьня важнейшай дырэктывы партыі.

Выходзячы з гэтага сакратарыят ГК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. За апартуністычны адносіны да важнейшага палітычнага мерапрыемства партыі і парушэньне партыйнай дысцыпліны — сакратару парткалектыву цягі т. **Шоту абвясьціць суровую вымову**, папярэдзіўшы, што калі ён не забясьпечыць бальшавіцкага правядзеньня чысткі — будзе пастаўлена пытаньне аб яго партыйнасьці.

2. Адзначаючы, што сакратар парткалектыву заводу імя Мясьнікова тав. **Шлемін** не забясьпечыў поўнай яўкі на партсход, чым спрыяў зрыву партсходу, — **абвясьціць т. Шлеміну вымову**, катэгарычна папярэдзіўшы яго аб неабходнасьці ў далейшым самых сур'ёзных адносін да выкананьня дырэктыў партыі.

3. Старшыню праўленьня чыгуначнага клюбу імя Ільліча тав. **Якімава** за ігнараваньне пастановы партыі аб чыстцы, які не папулярызаваў гэтай пастановы на чыгуначным вузьле, а таксама не абвясьціў тэрміну чысткі, не папрыхтаваў памяшканьня клюбу да правядзеньня сходаў па чыстцы, чым парушыў партдысцыпліну, чым садзейнічаў зрыву партсходу 5-VI, — **з партыі выключыць і з работы ў клюбе зьняць.**

4. Гарком КП(б)Б зварачае ўвагу ўсіх камуністаў чыгуначнага вузла, што справай іх гонару зьяўляецца зьнішчэньне вышэйпаказаных дэфектаў на працягу бліжэйшых дзён, што камуністы чыгункі павінны паказаць узоры бальшавіцкай арганізацыі ў правядзеньні чысткі і абавязак бюро парт'ячэек абгаварыць на ўсіх партсходах прычыны зрыву гэтага сходу.

Адначасова папярэдзіць усіх сакратароў парткалектываў і ячэек, што ў далейшым за малейшыя праяўленьні аслабленьня ў падрыхтоўцы і правядзеньні чысткі партыі, ГК будзе ўжываць у адносінах да вінаватых больш сур'ёзныя партпагнаньні, як за парушэньне партдысцыпліны і зрыў важнейшага палітычнага мерапрыемства партыі.

5. На ўвесь час чысткі прымацаваць да чыгуначнай арганізацыі тав. **Мінца**, якога папярэдзіць, што ён разам з сакратарамі парткалектываў адказвае за арганізацыю справы чысткі на вузле і праверку выкананьня пастаноў ГК.

6. Гэту пастанову абгаварыць на спэцыяльных партсходах усёй партарганізацыі і апублікаваць у друку.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б
КУДЗЕЛЬКА.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ РАХУНАК КАМУНАРАЎЦАЎ

(*На чыстцы партарганізацыі Эльводу*)

Такой актыўнасьці, такога ажыўленьня на **менскай электрастанцыі** яшчэ ня было. 30—40 асоб выступае штодня. Выяўляюць дрэнныя бакі таго ці іншага камуніста, зварачаюць увагу на лепшыя вопыты яго работы.

— Таварышы! — гаворыць старшыня камісіі тав. **Хадасэвіч**. — Паступіла заява ад рабочых заводу «Камунар». Яны просяць слова. Як, дамо?

Згоду выказалі аплёдысмэнтамі.

На трыбуне рабочы машынабудаўнічага заводу «Камунар» тав. **Хаймоўскі**.

— Камунараўцы даручылі мне перадаць вам сацыялістычны рахунак. Таварышы! Па вашай віне мы недавыканалі свой прамфінплян. Вамі недадана гораду, як вы ўжо адзначалі, 385 гадзін электрычнага сьвятла. І гэтыя вашы тры сотні гадзін усім заводам і фабрыкам нашага гораду прынесьлі вялікую шкоду, яны прынесьлі дзесяткі і сотні тысяч прастояў чалавекагадзін.

— 15.193 гадзін мы зрабілі прастояў выключна па вашай віне, з-за вашых перабояў у падачы сьвятла. А гэтыя прастоі каштуюць дзяржаве 62.000 руб. Інакш кажучы, з-за вашай зусім дрэннай работы, мы не зрабілі 61 кампрэсарабілку, або 180 тачыльных варштатаў.

— Вы, па нашай думцы, ня гледзячы на ўсе вашы посьпехі, працуеце яшчэ вельмі дрэнна. Мы лічым, што на вашай электрастанцыі ня ўсё ў парадку. Пры самым актыўным удзеле ў правядзеньні чысткі партыі вы павінны выкрыць гэта зло. Мы патрабуем ад вас ва што-б там ні стала дабіцца поўнай ліквідацыі перабояў у падачы сьвятла.

Ад імя рабочых электрастанцыі з адказным словам выступіў сакратар партыйнага калектыву тав. **Шчупак**.

— Сацыялістычны рахунак рабочых «Камунара», бязумоўна, зьяўляецца правільным, — гаворыць Шчупак, — і яго трэба прыняць. Мы запэўняем рабочых «Камунара», што перабоі ў падачы сьвятла прадпрыемствам гораду на працягу бліжэйшага часу будуць ліквідаваны.

Пасьля гэтых выступленьняў актыўнасьць рабочых электрастанцыі яшчэ больш павысілася.

7 чэрвеня прайшоў чыстку рабочы-вылучэнец з электрастанцыі т. **Місюра**.

Місюра — член КП(б)Б з 1925 году. На электрастанцыі працуе з 1924 году. Перад гэтым тры гады быў у Чырвонай армії. А раней — на бядняцкай сялянскай гаспадарцы пры бацькох. На электрастанцыі працаваў спачатку чорнарабочым, потым качагарам і два гады памочнікам машыніста. У 1929 годзе тав. Місюра выбіраецца старшынёй заводзкага камітэту. А ў 1930 годзе тав. Місюра, як лепшы рабочы-ўдарнік, калектывам электрастанцыі вылучаецца на адказную работу ў ЦП саюзу мэталістаў. Зараз тав. Місюра — старшыня ЦП саюзу камунальнікаў, у які ўваходзяць рабочыя менскай электрастанцыі.

Місюра доўга не гаварыў. Ён коратка і выразна спыніўся на сваёй аўтабіяграфіі і непасрэднай рабоце як партыйнай, так і прафсаюзнай.

ЦП саюзу камунальнікаў, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і вышэйшых прафсаюзных арганізацый, за апошнія пяць месяцаў дабілася рашаючых перамог. Для рабочых менскай электрастанцыі закончана пабудова чатырох новых жыльлёвых дамоў. Для рабочых трамвайшчыкаў хутка будзе закончан адзін дом. Сталовыя зараз ёсьць пры кожным камунальным прадпрыемстве. У мінулым годзе на электрастанцыі ня было сталоўкі, а зараз яна ёсьць, і ня дрэнная. Дзіцячыя сады арганізаваны для дзяцей віцебскіх трамвайшчыкаў і рабочых менскай электрастанцыі.

Недахопаў яшчэ вельмі шмат. Сталовыя, напрыклад, працуюць з вялікімі перабоямі.

Сярод трамвайшчыкаў ёсьць яшчэ вельмі многа клясава-чужых элемэнтаў, за апошнія дні вычышчана 13 кулакоў.

Прафсаюзныя заводзкія камітэты трамвайшчыкаў, і **Менску, і Віцебску**, вельмі мала займаліся праверкай работы асобных вагонаважатых, асобных кантралёраў і іншых работнікаў.

У спрэчках рабочыя гаварылі аб старшыні заводзкага камітэту электрастанцыі тав. **Янкоўсім**, гаварылі і аб іншых камуністах, якія слаба змагаюцца за паляпшэньне культурна-бытавых і матар'яльных умоў рабочых.

Актыўнасьць, з якою прайшла чыстка т. Місюра, як нельга лепш паказвае, што рабочыя не забываюць пра сваіх вылучэнцаў і з усёй рашучасьцю патрабуюць, каб яны апраўдалі аказанае ім давер'е.

Тав. Місюру на трыбуне зьмяніе рабочы-ўдарнік тав. **Навіцкі**.

— Нарадзіўся я ў сям'і рабочага-цесьляра. Сам да 1910 году быў батраком. Працаваў у паноў, кулакоў і інш. Атрымліваў па 12 кап. у дзень. Потым паступіў на машынабудаўнічы завод уласьніка Ліўшыца ў Менску. Цяпер гэты завод зусім ня той, ён носіць назву **«Камунар»**.

— На электрастанцыі працую з 1918 году. У партыю ўступіў у 1925 годзе, у часе ленінскага прызыву. Зараз член бюро цэх'ячэйкі КП(б)Б, начальнік каманды СПА. Наведваю партыйную школу.

У спрэчках выступіла 7 чалавек. І ні адзін не сказаў дрэннага слова аб Навіцкім.

— Усім рабочым, усім камуністам трэба працаваць так, як працуе тав. Навіцкі, — гаварылі яны.

9 чэрвеня, на пятым дні чысткі КП(б)Б, камісія, пры такім-жа ўдзеле рабочых электрастанцыі, працавала з 10 гадзін раніцы да 1 гадзіны дня. А вечарам — з 4 да 7. Праверана за дзень 6 членаў КП(б)Б і 4 кандыдаты. Спачатку чысткі на электрастанцыі ўжо праверана 34 камуністы.

Добрая падрыхтоўка забясьпечыла гэты посьпех. Вопыт работы камісіі па чыстцы на электрастанцыі трэба перанесьці ў іншыя калектывы і ячэйкі прадпрыемстваў Менску.

В. СТАЛЬНОЎ.

Аб барацьбе фабрык за прамфінплян і пастаноўку партмасавай работы

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б АД 7 ЧЭРВЕНЯ 1933 ГОДУ ПА ДАКЛАДАХ САКРАТАРОЎ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ ШВЭЙНЫХ ФАБРЫК «КАМІНТЭРН» (ГОМЕЛЬ) І «ПРАФІНТЭРН» (ВІЦЕБСК)

ЦК КП(б)Б адзначае, што партарганізацыі фабрык, далучаючыя па «Прафінтэрну» 206 чал. і па «Камінтэрну» 232 камуністы, ня здолелі ў сваёй практычнай рабоце асноўную ўвагу накіраваць на выкананьне важнейшых вытворчых задач.

Ня гледзячы на тое, што ў паказаных фабрыках якасьць прадукцыі да гэтага часу нездавальняючая, барацьба за якасьць прадукцыі невыстарчальна разгорнута, нават ніяка распраўленай сыстэмы штодзённай барацьбы з бракам і пераробкамі, выяўленьне браку, устанаўленьне матар'яльнай адказнасьці за брак і работы па ўмяцаньні кваліфікацыі адстаючых рабочых.

Як на «Камінтэрне», так і на «Прафінтэрне» партарганізацыі невыстарчаць на мабілізавалі масы і асабліва новых рабочых вакол пытаньня авалодваньня тэхнікай, догляду машын і абыходжаньня з імі. На «Прафінтэрне» устанаўлівалася практыка падмацаваньня слабеючага часу швейнай машыны шляхам падкідваньня ласкутоў пад галоўку машыны, з-за чаго атрымліваецца перакос машыны, там-жа залазь за ўсіх машынах зьняты бакавыя крышкі і ў адказных частках машыны палядаюць пясок і бруд. У выніку—спорадычныя машын вялізарнае. Кошт рамонту машын на «Прафінтэрне» раўняецца 49 проц. кошту ўсіх машын, на «Камінтэрне»—29 проц.

Ня выконваюцца планы зьніжэньня сабекошту, на фабрыцы «Прафінтэрн» сабекошт павялічыўся за 1932 год на 3,4 проц. Цэхавае плянаваньне і гаспадарчы разрахунак пастаўлены дрэнна.

Зьмест масавай работы, як аб'ём і ступень ахопу новых рабочых большавіцкім уплывам далёка нездавальняючыя. Пытаньні на парткалектывах ставяцца больш за ўсё ў парадку агульных справаздач: «Аб становішчы цэху, але не аб кожнай дэталі работы ў пасобоку». Цэхавыя ячэйкі і парторгі заслухоўваюцца вельмі рэдка, адзін раз у 8-9 месяцаў. У партарганізацыі фабрыкі «Камінтэрн» сакратары цэхавых ячэек заяўляюць, што ім «няма часу заслухоўваць парторгаў аб іх працы, таму партгрупы амаль не працуюць».

Да сацпаборніцтва і ўдарніцтва адносіны фармальныя, палітмасавая работа праводзіцца больш у парадку агульна-фабрычных мітынгаў і цэхававыменных сходаў, што не забясьпечвае выкананьня лёзунгу партыі аб ахопе партмасавай работай кожнага рабочага ў пасобку. Камуністы далёка ня ўсе адкрываюць авангардную ролю на выт ворчасьці. Дрэнна выконваюць парт-абавязкі, напрыклад, запазычанасьць па членскіх узносах вельмі высокая. На «Прафінтэрну» 70 чал. звыш трох месяцаў ня плацяць членскіх узносаў.

Выходзячы з усяго гэтага і адзначаючы, што гэтыя недахопы ў асноўным да тычаць большасьці фабрык швейнай прамысловасьці БССР, сакратарыят ЦК КП(б)Б прапануе правесьці наступнае:

1. У адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б) ад 7 жніўня 1932 году, пастановамі ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб партмасавай рабоце на прадпрыемствах, перабудаваць работу парткалектываў швейных фабрык «Камінтэрн» і «Прафінтэрн» з тым, каб цэхавыя ячэйкі і партгрупы сыстэматычна займаліся вытворчымі пытаньнямі, ставячы асобныя з іх—як пабудова тэхналягічных працэсаў вытворчасьці, якасьці прадукцыі, асваеньня рабочымі тэхнікі вытворчасьці, мяццэвасьцяга плянаваньня і г. д.—на абмеркаваньне бюро, агульных сходаў і, не падмяняючы адзіначальніка, дапамагаць гаспадарніку ў распрацоўцы і правядзеньні важнейшых гаспадарчых мерапрыемстваў.

2. Неадкладна распрацаваць пытаньні на паляпшэньні тэхнічнага кантролю, умацаваўшы склад прыёмчыкаў за лік кваліфікаваных і клясава-праверэных работнікаў і ўстанавіўшы матар'яльную адказнасьць бракаробаў.

Арганізаваць вучобу камуністаў і рабочых па аўладаньні тэхнікай вытворчасьці і вывучэньні машын як у працэсе вытворчасьці, так і ў пастаноўцы тэарэтычных, а таксама калектыўным абгаварэньні на партыйна-вытворчых канфэрэнцыях і нарадах.

Увесьці на фабрыках плянава-папераджальны рамонт і галепшыць якасьць бягучага рамонту машын, павысіўшы кваліфікацыю механікаў.

3. Павысіць авангардную ролю кожнага камуніста на прадпрыемстве, увялаючы правядзеньне падрыхтоўчай работы да чысткі партыі з непазрэдным праверкай якасьці выкананьня кожным камуністам даручанай яму справы, парт абавязкаў.

4. Парткалектывам у справе пастаноўкі рабочага снабжэньня зьвярнуць асаблівую ўвагу на па-заплянаваньне заготоўкі і своячасную і якасную прапоўку і ўборку гародаў у прыгарадных гас. падарках з тым, каб ня толькі ў летні перыяд налаадзіць бесьперабойнае забясьпячэньне рабочых гародзінай, але і даць магчымасьць заготовіць на зіму.

5. Парткалектывам пераглядзець струк туру партарганізацый, максымум скарайшы лік ячэек. Стварыць больш буйныя цэхавыя ячэйкі, пакідаючы зьменавыя ячэйкі там, дзе ў зьмене налічваецца ня менш 30-40 чал. членаў і кандыдатаў партыі. Асобна праверыць пабудову партгруп, пакідаючы найбольш буйныя партгрупы—6-7 камуністаў. Умацаваць ячэйкі за лік перакіду сакратарамі асноўных ячэек платных работнікаў парткалектываў (агітмас, культпроп і г. д.).

6. Надаўшасьць 60 проц. жанчын-работніц у складзе рабочых фабрык абавязвае парткалектывы фабрык набудаваць сваю работу, прыстасоўваючы ўсю сыстэму масавай работы да запатрабаваньняў і асаблівасьцяй паасобных груп работніц, забясьпечваючы пры гэтым усямернае павышэньне кваліфікацыі работніц, павышэньне іх сацыяльна-бытавога абслугоўваньня і вылучэньне работніц на адказную гаспадарную, партыйную і прафсаюзную работу.

7. Уся масава-агітацыйная работа павінна быць пабудавана ў напрамку дыферэнцыяванага ахопу рабочых (старых, новых, маладых), арганізоўваючы пры гэтым прымацаваньне старых рабочых да новых кадраў для перадачы ім свайго вопыту і навыкаў у шматгадовай рабоце на вытворчасьці.

8. Павысіць якасьць палітвучобы камуністаў. Асобную ўвагу аддаць пытаньню правільнага растлумачэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, ускрываючы на канкрэтных фактах, скажэньні нацыянальнай палітыкі, контр-рэвалюцыйную сутнасьць вялікадзяржаўнага шавінізму, беларускага і яўрэйскага шавінізму, выкрываючы кожнага камуніста і беспартыйнага рабочага ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізму, на барацьбу з вылазкамі клясавага ворага, захаваньнямі пад фальшывым нацыянальным сьцягам.

9. Лічачы абсалютна нездавальняючай работу парткалектываў па кіраўніцтве камсамолам, ЦК абавязвае бюро парткалектываў фабрык «Прафінтэрн» і «Камінтэрн» забясьпечыць поўнае выкананьне рашэньняў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб мерапрыемствах па дапамозе камсамолу.

10. Адзначаючы ў працы фабрык «Прафінтэрн» і «Камінтэрн» сыстэматычныя прарывы ў выкананьні прамфінпляну фабрык як зараз, так і ў папярэднія гады, ЦК КП(б)Б катэгарычна папярэджвае трыкутнікі фабрык «Прафінтэрн» і «Камінтэрн», што ў іх, як і ва ўсёй швейнай прамысловасьці, яшчэ няма ніякіх падстаў працаваць з прарывамі, што далейшыя прарывы ў выкананьні прамфінпляну фабрыкі ЦК будзе расцэньваць выключна, як нявуменьне партыйнага, гаспадарчага і прафсаюзнага кіраўніцтва па-бальшавіцку працаваць.

11. Даручыць арфінстру папулярызаваць выкуплены ім вопыт работы швейнай фабрыкі («Труд», Масква) па ўсіх швейных фабрыках БССР.

12. ЦК абавязвае фракцыю ЦП саюзу швейнікаў і партыйную частку Швейтрэсту і Наркамлёгпрому прыняць неабходныя меры для зьняцьця ўсіх наяўных недахопаў у рабоце прадпрыемстваў і асаблівае па паляпшэньні вопыту лепшых прадпрыемстваў.

13. Указаць ГК і РК на неабходнасьць узмацненьня кіраўніцтва работай партарганізацый швейнай прамысловасьці, якая зьяўляецца асноўнай прамысловасьцю БССР, маючы буйнейшыя прадпрыемствы — «Сьцяг індустрыялізацыі», «Кастрычнік» і інш., высокім тэхнічным абсталяваньнем, новай савецкай машынай.

Мін-Хуа

КУЛЬТУРНЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ САВЕЦКАГА КІТАЮ

Да ўстанаўленьня савецкай улады па мешчыкі «джэнтры» і жрацы, дзейнічаючы рука ў руку з мілітарыстамі, гаміндананаўскімі чыноўнікамі і імпэрыялістамі, рабілі ўсё, што было ў іх сілах, каб трымаць у цемры працоўныя масы стаўшых цяпер савецкімі раёнаў Кітаю. Яны культывавалі забабоны, паганства, паланьненьне продкам, фэадальныя і барбарскія звычаі, накшталт калечаньня ног у дзяўчын, канкубінату, дзіцячага і жаночага рабства «прыёмных нявестак» (маладыя дзяўчыны ў Кітаі аддаюцца на выхаваньне сваім будучым сьвякрухам) і г. д. Школ было мала. За навучаньне ў школе трэба было плаціць так дорага, што вучыцца маглі толькі багатыя. Настаўнікі былі лёкаямі пануючай клясы, а ў місіянерскіх школах—лёкаямі імпэрыялістаў і іх нанчя была средкам утрымаць масы ў падначаленьні і невуцтве.

З прыходам савецкай улады, становішча значна зьмянілася. Кітайскі савецкі ўрад ўжо і поўна ўяўляе сабе ўсё значэньне культурнага разьвіцьця працоўных мас і садзейнічае культурнаму будаўніцтву на сваёй тэрыторыі.

Пад кіраўніцтвам кітайскай кампартыі савецкая улада правяла рад мер для павышэньня культурнасьці працоўных насельніцтва. Манастыры і храмы былі закрыты, манахі і манашкі распушчаны. Кончынам дана свабода і поўнае роўнаправе з мужчынамі. Работа, канкубінат і розныя барбарскія сярэдзь-вяковыя звычаі скасаваны. Савецкая ўлада імкнецца да поўнай замены старой «культуры» новай сацыялістычнай культурай. Гэтыя меры былі праведзены пры поўным падтрыманьні працоўных мас. Савецкі ўрад дзейнічаў з вялікім тактам, каб аслабіць супраціўленьне адсталых пластоў насельніцтва яго наступленьню на дрэнныя старыя звычаі. У параграфе 13-м Канстытуцыі савецкага Кітаю ўказваецца, што работнікам, селянам і працоўнаму насельніцтву гарадоў гуцца свабода веравызнаваньняў. Але дзяржава не абаранае рэлігіі. Савецкія грамадзяне свабодна могуць весьці антырэлігійную прапаганду. Вучоба ў Савецкім Кітаі цесна пераплецена з вытворчасьцю і ваеннай справай. Гэта вынікае з асобнага эканамічнага становішча савецкага Кітаю і бесьперапыннай вайны паміж саветамі—з аднаго боку і гаміндананам і імпэрыялістамі—з другога. Таму на ўсіх школах выкладаецца ваенная справа і навучаньне вытворчым навыкам.

Ужо існуе мноства рэвалюцыйных пачатковых школ і сярэдніх навучальных устаноў. Савецкі ўрад імкнецца да таго, каб у школах вёсцы была пачатковая школа і ВНУ—у кожнай акрузе. Як відаць са справаздачы, у мінулым годзе ў савецкіх раёнах заходняга Хунаня і Хубэю ўжо існавала 292 пачатковыя школы з 12 тыс. вучняў. У адной Лі-Яскай акрузе было больш 50 пачатковых школ і адна сярэдняя школа. Пры кожнай з гэтых школ ёсьць вячэрнія курсы для дарослых. У школах хлапчукоў і дзяўчат, апрача заняткаў па прадметах, навучаюць такім рэчам, як выяўленьне імпэрыялістычных і гаміндананаўскіх шпіёнаў, дапамога Чырвонай армії, барацьба супроць контр-рэвалюцыйных элемэнтаў. Большая частка савецкай моладзі арганізавана. Ёсьць піянэры (маладзей 16 год) і «малады авангард» (ад 16 да 23 год). Лік членаў піянэрарганізацыі ў савецкіх раёнах Заходняга Хунаня і Хубэю, як указвае справаздача за мінулы год, складаў 80.756, а лік маладых авангардыстаў—145.402. Моладзь арганізуе рэвалюцыйныя спаборніцтвы на дэкламацыі і мастацкім паказе рэвалюцыйных лёзунгаў, пісьмяны рэвалюцыйных сьпеваў, пісаньні апавяданьняў аб рэвалюцыйных падзеях і г. д.

Моладзь адыгрывае вялікую ролю ў культурным руху Савецкага Кітаю. Яна арганізуе антырэлігійныя гурткі, групы па барацьбе з няпісьменнасьцю. Яны адпраўляюцца ў гушчу самых адсталых пластоў насельніцтва, каб прапагандаваць супроць веры ў Буду, ідалапаклонства, чараўніцтва. З другога боку, яны вучаць народ чытаць і пісаць, папярэджваюць навуковыя веды, садзейнічаюць санітарна-гігіенічным мерам і на выкам, расказваюць аб падзеях як на ўнутраных, так і міжнародных і г. д. Ператвараючы манастыры і храмы ў культурныя цэнтры і школы для рабочых і сялян, гэтыя юнакі і дзяўчаты працуюць, як сапраўдныя ўдарнікі культуры. Яны ідуць на гэту работу часта супроць жаданьня і нават ня гледзячы на пагрозы сваіх бацькоў. Яны разьбіваюць ідалаў. Яны вешаюць у былых храмах партрэты Маркса і Леніна. Гэта моладзь прымае актыўны ўдзел у барацьбе супроць контр-рэвалюцыйных арганізацый. У мінулым годзе яна правяла барацьбу і зьнішчыла такія арганізацыі, як «Клюб каханьня», «Клюб шукальнікаў каханьня», «Пачэсная ліга моладзі», «Юнацкая асацыяцыя нацыянальнага выратаваньня», «Клюб эпі курэйцаў» і г. д. Усе гэтыя арганізацыі былі філіяламі гаміндананаўскай лігі «АВ» (Антыбальшавіцкая ліга).

Выхаваньне і навучаньне савецкай моладзі так глыбока вымянілі яе ідэалёгію і паводзіны, што нават Гаміндан вымушан адпасьці ім належнае. Пры захопе савецкага раёну Хунгху ў правінцыі Хубэй гаміндананаўскія мілітарысты злавілі 11-гадовага піянэра і пачалі дапытваць яго. На запытаньне, каго трэба забіваць, піянэр адказаў: «капіталістаў, памешчыкаў, «джэнтры», гаміндананаўцаў». Тады дапытваўшыя сказалі, што яго самога трэба забіць. Піянэр закрычаў: «Ну, што-ж забівайце мяне». Гэты выпадак быў апісан у гаміндананаўскай газэце, якая пры гэтым абурылася тым, наколькі далёка зашло «псаваньне» моладзі ў савецкіх раёнах.

Для навучаньня дарослых існуюць рабоча-сялянскія школы, зімовыя школы, вячэрнія школы, раніцныя школы і г. д. Апрача гэтых навучальных устаноў для дарослых пры кожнай школе для дзяцей і падлеткаў існуюць яшчэ школы пісьменнасьці для дарослых. Пры гэтых школах арганізаваны чытальні, у якіх пісьменныя чытаюць пісьменным газэты, часопісі, уладаваньне дакрэты. У асьвеце дарослых у Савецкім Кітаі шырокае прыстасаваньне знай шлі тэатр, кіно і г. д. Гэта культработа асабліва зьяўляецца пасьпяховай, калі справа ідзе аб уцягненьні жанчын. Час ад часу наладжваюцца мітынгі на адкрытым паветры, на якіх масам даецца палітычная асьвета. Час ад часу праводзяцца таксама кампаніі вялізарнага маштабу па барацьбе з няпісьменнасьцю і ўцягненьні ў школы па ліквідацыі няпісьменнасьці, якія ўсяляк падтрымліваюцца ўрадам.

З самага пачатку савецкай улады ма кадыя жанчыны ў савецкіх раёнах Кітаю праяўляюць вялізарную цікавасьць да культурнай і асьветнай работы. Яны імкнуцца ў школу або хоць-бы ў гурток для чытаньня. Яны арганізуюць гурткі па чытаньні газэт, гурткі па навучаньні розным навукам, дыскусыйныя сходы, харавыя гурткі, драматычныя гурткі, гурткі па павышэньні свай го культурнага і палітычнага ўзроўню. Работніцы, раней ня ведаючыя нічога, цяпер выступаюць з прамовамі на вялікіх сходах. Яны аддаюць увагу асабістай гігіене. Яны аматаюцца супроць традыцыі раньняга шлюбу, якая ўкаранілася ў іх. Іх адносіны да мужчын надзвычай зьмяніліся. Мужчына, які ня прымае ўдзелу у барацьбе супроць гаміндану і імпэрыялістаў, ня прымае ўдзелу ў рабоце савецкай улады, ня можа разьлічваць на добрыя адносіны жанчын сваёй сям'і. Лёзунг працоўных жанчын—«ня выходзіць замуж за мілітарыстаў, бюракратаў, памешчыкаў, буржуа, тухао, джэнтры і кулакоў». Жанчына лічыць для сябе за гонар выйсьці замуж за члена кампартыі, за члена камсамолу, ва чырвонагвардзейца. Наколькі глыбока саветызаваліся гэтыя дзяўчыны, можна бачыць з ваеннага загаду гаміндананаўскага губернатара Гуандзяня, Чэн Цэй-Танга, салдаты якога ядуць вайну супроць савецкай улады ў правінцыі Цзянсі. У гэтым загадзе ён забараніе салдатам жаніцца на дзяўчынах правінцыі Цзянсі, бо яны сталі такімі савецкімі, што заўсёды аказваюцца «савецкімі шпіёнкамі».

Раскажу аб навучаньні Чырвонай армії. Як і Чырвоная армія Савецкага саюзу, Чырвоная армія Кітаю зьяўляецца адной з асьветніцкіх сіл, дзякуючы гэй ўльзе, якую аддае ёе стварэньню савецкі ўрад. Апрача палітгуртка і музычных гурткоў, клясаў, у кожнай часьці ёсьць «ленінскае таварыства», якое вядзе культурна-асьветную работу сярод салдат даной часьці. Ня гледзячы на гое, што ў Чырвонай армії няма вялікіх магчымасьцяй у гэтым сэнсе, бо яна бязупынна вядзе вайну з гаміндананаўцамі і імпэрыялістамі, яе культурныя дасягненьні, рэзультаты выказваўчай работы сярод салдат зьдзіўляючыя. Так, у 1930 г. першая армія, якой камандуе тав. Чу-Дэ, складалася на 90 проц. з няпісьменных, у 1932 г. суадносіны сталі процілеглымі, у ёй было 90 проц. пісьменных і толькі 10 проц. няпісьменных.

Цікавай рысай Чырвонай армії зьяўляецца арганізацыя салдат прапагандыстаў. У кожным аддзяленьні ёсьць 5 такіх салдат. Куды-бы ні прыбыла Чырвоная армія, гэтыя салдаты прымаюцца за работу сярод насельніцтва. Два салдаты расклейваюць плякаты, два

У фашысцкай Германіі

Бязупынныя масавыя арышты і вобыскі ў рабочых раёнах

БЭРЛІН, 8 (Белта). Сёньня паліцыя ачапіла калёнію беспрацоўных у раёне Шэнэбэргу, правяла пагалоўны вобыск ва ўсіх бараках і зрабіла шмат арыштаў. Згодна паліцэйскага паведамленьня, выяўлена нібыта вялікая колькасьць камуністычнай літаратуры.

У Вюрцбэргу зроблены масавыя вобыскі, у часе якіх нібыта знойдзена шмат камуністычнай літаратуры. Арыштавана 42 рабочых. У Людвігсгафэне арыштаваны 4 рабочых, якія нібыта павінны былі прыняць удзел у сходзе, скліканым кампартыяй у лесе. Сярод арыштаваных—былы кам дэпутат ляндтагу Баўмгэртнэр.

Востры канфлікт у лягеры фашызму

Бойка паміж нацыяналістамі і штурмавікамі

БЭРЛІН, 8 (Белта). У Фрэйкэвальдзе ў сутычках паміж членамі нацыяналісцкай баявой арганізацыі «Кампфрынг» і штурмавікамі некалькі чалавек з абодвых бакоў былі цяжка паранены. Штурмавікі арыштавалі кіраўніка мясцовай арганізацыі партыі нацыяналістаў Взэльце і аднаго цяжка параненага ў часе бойкі актыўнага работніка «Кампфрынг» Брэкке.

„Газэта Гандлёва" аб польска-савецкіх адносінах

ВАРШАВА, 9 (Белта). «Газэта Гандлёва» цалкам прысьвячае ўчарайшы нумар праблеме польска-савецкіх гаспадарчых адносін. У артыкулах адзначаецца, што ўзаемныя візыты польскіх і савецкіх гаспадарнікаў, асабліва прыезд у Польшчу савецкай дэлегацыі стварылі спрыяючую абстаноўку для пашырэньня таваразвароту паміж Польшчай і СССР.

Замежная хроніка

Прэзыдэнт Рузвэльт зацьвердзіў прыняты кангрэсам законапраект аб адмене плацяжоў у золаце па ўсіх дзяржаўных і прыватных абавязацельствах ПАЗШ. Замест золата аплата робіцца ў паперовых грашовых знаках ці фрэбры.

* Жэнэўскі суд па справе аб антыфашысцкіх дэманстрацыях 9 лістапада мінулага году прыгаварыў Нікоця да 6-ці месяцаў турмы і асталіных да турмы ад 2-х да 4 месяцаў.

* Амэрыканскі лётчык Джэнс Матэрн вылецеў сёньня з Омску а 1 гадзіне 10 мінут па маскоўскім часе, узяўшы напрамак на Чыту.

АПОШНІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Паведамленьне японскага пасла ў Маскве п. ОТА

МАСКВА, 9 (Белта). 8 чэрвеня г. г. японскі пасол п. ОТА наведаў намесьніка народнага камісара па замежных справах тав. САКОЛЬНІКАВА і зрабіў яму наступнае паведамленьне:

«3-га чэрвеня Савецкі ўрад паведаміў японскаму ўраду, што ён прымае прапанову японскага ўраду наконт перагавораў аб продажы КУЧ і згодзен назначыць сваіх прадстаўнікоў для перагавораў і што ён не пярэчыць супроць вядзеньня перагавораў у Токіё з прадстаўнікамі Манчжоу-Го. Адначасова з гэтым, Савецкі ўрад са свайго боку прапанаваў пачаць перагаворы 25 чэрвеня.

Прапанова гэта была японскім урадам перадана Манчжоу-Го, каб пацьвердзіць думку апошняга. З гэтага повада і атрыман адказ аб тым, што Манчжоу-Го не пярэчыць супроць адкрыцьця перагавораў, як было прапанавана вышэй,—25 чэрвеня.

Паведамляючы аб вышэйпамянёным, японскі ўрад просіць савецкі ўрад, як толькі адбудзецца рашэньне аб сваіх прадстаўніках для даных перагавораў, паведаміць яго неадкладна аб гэтым».

Страты Усурыйскай чыгункі ў сувязі са спыненьнем простых грузавых зносін з КУЧ

ХАБАРАЎСК, 8 (Белта). Праўленьне Ўсурыйскай чыгункі высьвятляе разьмер страт, прычыненых дарозе парушэньнем з боку КУЧ існуючай паміж абедзьвюма дарогамі спэцыяльнай камэрцыйнай згоды аб простых грузавых зносінах. Пасьля дакладнага высьвятленьня страт, мяркуецца прад'яўленьне іску аб кампэнсацыі іх з боку КУЧ.

Германія абвясьціла мараторы па замежных даўгох

БЭРЛІН, 9. (БЕЛТА). Апублікавана пастанова рэйхсбанку аб спыненьні з першага ліпеня 1933 г. трансфэру плацяжоў па замежнай запазычанасьці. Мараторы не закранае толькі тэй часткі атрыманых Германіяй кароткатэрміновых крэдытаў, якія прадугледжваюцца згодаю аб непатрабоўваньні крэдытаў. Гэта частка складае каля 3,8 мільярдаў марак з усёй сумы германскай замежнай запазычанасьці ў 19-20 мрд марак. У пастанове падкрэсьліваецца, што мараторы «часовы» і не азначае неплатаздольнасьці Германіі. Асобным законам рэйхсбанк абавязваецца зьнізіць плацяжы па замежнай запазычанасьці ў германскай валюце і стварыць спэцыяльныя «канвэрсыйныя касы». Адначасова апублікован ліст праўленьня рэйхсбанку германскаму ўраду, у якім прыводзяцца прычыны, прымусіўшыя рэйхсбанк абвясьціць мараторы. У лісьце ўказваецца, што запаты і валютны заказ рэйхсбанку, які складаў у канцы чэрвеня 1930 г. 3.078 млн. марак, зьменшыўся на 31-V—33 г. да 280 млн. марак.

Катаржныя прысуды над рабочымі ў Варшаве

ВАРШАВА, 9 (Белта). У апошні час у Варшаве адбыўся рад буйных працэсаў супроць рэвалюцыйных рабочых. Падсудныя абвінавачваліся ў прыналежнасьці да польскай кампартыі. З 12 рабочых, асуджаных за арганізацыю рэвалюцыйнага выступленьня ў Варшаве, адзін быў прысуджан да 8 год катаржнай турмы, 5—да трох год кожны, чацьвёра—да год, рэшта—ад 3-х да 2-х год турмы. У працэсе фігуравала 5 чал., якія абвінавачваліся ў прыналежнасьці да рэдакцыйнага камітэту КП Польшчы. У якасьці галоўнага абвінаважанага фігураваў паручык рэзэрвы Стшэшэўскі, які, згодна абвінавачаньня акту, вёў камуністычную прапаганду сярод чыгуначных служачых. Ён прысуджан да 5 год катаржнай турмы, двое—да чатырох, двое апраўданы.

ДЗЕЦІ НАРОДЖАНЫЯ КАСТРЫЧНІКАМ

Менская гарадзкая алімпіяда школьнага і піянэрскага самадзейнага мастацтва

На здымках зьлева направа: 1. Выступленьне шумавога аркестру першай савецкай школы пад кіраўніцтвам Леўчанкі. 2. Піянэрка ФІДЛОН 13 год, вучань музтэхнікуму, выканала на раялі УЛАСНЫЯ ТВОРЫ: «ВЯСНОЙ У КАЛГАСЕ», «НА СЬМЕРЦЬ ІЛЬЛІЧА». 3. На алімпіядзе выступіў ксілафаніст вучань 30 школы піянэр ГРОСМАН, ён выканаў некалькі народных сьпеваў на ўласнаробленым інструманце. 4. БЫХАЎСКАЯ ФІРА 13 год, студэнтка музтэхнікуму (кляса Арлова), выканала на віалёнчэлі першую частку канцэрту Гольтэрмана. 5. ЕСЯ МАЙСТЭР 6 з папавай год, вучань музтэхнікуму (кляса Бясьсьмертнага), выканаў на скрыпцы «ПЧОЛКУ» — музыка Шуберта і «ГАВОТ» — музыка Люлі. 6. Заля клюбу харчавікоў, дзе адбываецца алімпіяда, перапоўнена маладымі слухачамі.

15 чэрвеня скончыць і праверыць уручэньне абавязацельстваў на цьвёрдыя пастаўкі

У Клімавічах граюць лічбамі. Прымушаюць іх расьці, зьмяншацца, стабілізавацца — у залежнасьці ад таго, як гэта «выгадней» раённым арганізацыям.

У лістападзе мінулага году райзад даў афіцыяльныя весткі ў Наркамзем БССР аб засеянай плошчы азімых. Па водле гэтых вестак па раёне было засеяна 20.204 га зямлі, у тым ліку калгасамі—16.884 га, аднаасобным сэктарам—3.315 га.

Пасьля таго, як быў апублікован закон ураду аб абавязковых пастаўках збожжа дзяржаве, Клімавіцкі райзад ў заключнай справаздачы аб асеньняй сяўбе зьмяняе свае даныя. Ён дасылае новыя, яўна перапаменшаныя весткі. Разьмер засеянай плошчы азімых на гэты раз паказваецца 16.554 га—на 3.650 га менш.

Але на гэтым справа не капчаецца. Райзад ідзе яшчэ далей. Калі ў раёне прыступілі да налічэньня абавязацельстваў па цьвёрдых пастаўках, дык у зводках зьявілася зусім новая лічба—пасеўная плошча азімых складае ўсяго 16.241 га. Такім чынам, у Клімавічах атрымаўся «разрыў» у 3.963 га. Розьніца паміж першапачатковымі і цяперашнімі данымі аб азімым кліне складае па калгасах 3.268 га і па аднаасобным сэктары 695 га.

Круючыя раённыя арганізацыі добра ведаюць аб гэтых агідных камбінацыях райзада. Аднак, ніякіх мер ня прынята. РВК не заняўся дэталёвым высьвятленьнем сапраўдных прычын пляскі лічбаў.

Не паклапаціліся нават правесьці кантрольны абмер азімага кліну. Праўда, у адным сельсавеце такі абмер нібы праводзіўся, але матар'ялы ўдысь ці зьніклі.

Падрыхтоўка да цьвёрдых паставак збожжа і бульбы ў раёне не праводзіцца. Аб гэтым проста забыліся. Наколькі безадказна і бястурботна адносяцца раённыя арганізацыі да пашырэньня і правядзеньня закону ўраду, аб пастаўках сьведчыць той факт, што да гэтага часу, ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы вышэйшых органаў, яшчэ ня скончана выпіска і перадача абавязацельстваў калгасам і аднаасобным гаспадаркам на здачу прадукцыі.

За ўвесь час Прэзыдыум РВК ні разу не абгаворваў пытаньня аб цьвёрдых пастаўках. Разьмеркаваньне абавязацельстваў па калгасах, а таксама сьпісы аднаасобных гаспадарак з паказаньнем іх пасеваў прэзыдыумам РВК не зацьвярджаліся. Не ўстаноўлены таксама нормы здачы збожжа аднаасобнымі гаспадаркамі па асобных сельсаветах. Гэтыя нормы мэханічна павышаны для ўсіх сельсаветаў на 10 проц.

На 5 чэрвеня абавязацельствы ўручаны па збожжы на 88,7 проц., па бульбе—78,5 проц. Па Домамерыцкім сельсавеце дагэтуль ня выпісана яшчэ ні адно абавязацельства.

У раёне ня ўлічылі вялікага значэньня закону аб цьвёрдых пастаўках, ня здолелі па-бальшавіцку выкарыстаць яго для пасыляховага правядзеньня пасеўкампаніі. Позьняя перадача абавязацельстваў бязумоўна зьявілася аднэй з прычын адставаньня Клімаўшчыны ў веснавой сяўбе. На 5 чэрвеня плян выканан толькі на 83,3 проц., прычым асабліва адсталым вучасткам зьяўляецца аднаасобны сэктар—62,6 проц. Цесную сувязь ходу сяўбы з якасьцю падрыхтоўкі да загатовак можна ілюстраваць на прыкладах раду сельсаветаў. Там, дзе была праведзена аднаведная работа, дзе абавязацельствы былі перададзены своячасова, аднаасобны сэктар даў добрыя рэзультаты па сяўбе. Па Галіцка-Мыскім сельсавеце аднаасобнікі выканалі плян на 101 проц., Суддалаўскім на 115 проц. і г. д. Па такім-жа сельсавеце, як Аўтухоўскі, дзе толькі 25-га мая прыступілі да ўручэньня абавязацельстваў, аднаасобны сэктар ганебна зрывае плян сяўбы.

У працэсе налічэньня і выпіскі абавязацельстваў па цьвёрдых пастаўках, некаторыя сельсаветамі дапушчана правааапартуністычная практыка, якая праявілася ў недаабкладаньні кулацка-заможных гаспадарак. Так, па Міслаславіцкім сельсавеце цьвёрдазаданьнік Трабырын Тарас атрымаў абавязацельства па здачу 4,32 цэнтн. збожжа, замест 6,49 цэнтн. згодна ўстаноўленай урадам нормы. Цьвёрдазаданьнік Высоўскі Аўрам атрымаў абавязацельства на 3,9 цэнтн. замест 5,8 цэнтн. Такія-ж факты ёсьць і па Склімінскім сельсавеце. У Красасьцінскім сельсавеце цьвёрдазаданьнікам даведзены абавязацельствы па нормах сярэднящіх гаспадарак, без павялічэньня на 50 проц., як гэта ўстаноўлена законам ураду.

С. ГАЛКІН.

„ЗАГІНУЛІ" 3963 ГА

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎСЕСАЮЗНАГА ФІЗКУЛЬТУРНАГА СЬВЯТА

ВСФК БССР і Менская фізкультурная арганізацыя вядуць узмоцненую падрыхтоўку да ўсесаюзных спаборніцтваў па цяжкай атлетыцы і гімнастыцы. Да дня адкрыцьця спаборніцтваў горад упрыгожваецца сьцягамі, пёзунгамі, плякатамі і ілюмінацыямі. Асабліва ўпрыгожваецца вакзал, Другі Дом Саветаў, дзе зьмяшчаецца ВСФКБ, будынак ЦВК, Гарсавету, Усебеларускі Стадыён і інш.

З 11 чэрвеня пачынаюць зьяжджацца дэлегацыі фізкультурнікаў ад Саюзных Рэспублік. Першымі чакаюцца каманды УКРАІНЫ, МАСКВЫ і ЛЕНІНГРАДУ, за імі дэлегацыі ГОРКАГА, ЗСФСР, СЯРЭДНЯЙ АЗІІ. Усяго на спаборніцтвы чакаецца прыезд звыш 300 чалавек.

На сьвяты прыяжджаюць замежныя дэлегацыі з АЎСТРЫІ, АНГЛІІ, НЯМЕЧЧЫНЫ, НАРВЭГІІ і ШВЭЙЦАРЫІ. Апрача таго, у спаборніцтвах прыме ўдзел дэлегацыя ад ШВЭДЗКАЙ СЭКЦЫІ Чырвонага Спартінтэрну, якая зараз знаходзіцца ў Менску.

Гарадзкі Савет фізкультуры і рабочыя Менскіх прадпрыемстваў арганізуюць урачыстую сустрэчу гасьцей. Кожнае прадпрыемства прымацоўваецца да пэўнай дэлегацыі на ўвесь час спаборніцтваў. Каманду Масквы сустракаюць рабочыя заводу ВАРАШЫЛАВА, Ленінграду — завод «КАМУНАР», Горкага — абутковая фабрыка, УКРАІНЫ — завод імя МОЛАТАВА, Сярэдняй Азіі — фабрыка «КАСТРЫЧНІК».

Замежных гасьцей сустракаюць завод «Бальшавік», фабрыка «Камунарка», завод «Ударнік» і ФЗВ «КІМ».

Газэта «Чырвоная зьмена» разам з часопісьсю Физкультура и спорт» арганізуюць штодзённы выпуск спэцыяльнай газэты, прысьвечаны спаборніцтвам.

Конкурс на лепшую падрыхтоўку да новага навучальнага году

Калегія Наркамасьветы пастанавіла абвясьціць усебеларускі конкурс на лепшую падрыхтоўку да новага навучальнага году. Асноўнай задачай конкурсу зьяўляецца стварэньне для школ усіх неабходных умоў для далейшай пасьпяховай барацьбы за рэалізацыю дырэктыў ЦК партыі аб школе.

У задачы конкурсу ўваходзіць — да 15 ліпеня скончыць пабудову і рамонт школьных будынкаў, прыстасаваць былыя кулацкія дамы пад культасьветныя установы, адрамантаваць школьную мэблю і папоўніць абсталяваньне, забясьпечыць кожную школу апалам на ўвесь 1933-34 навучальны год.

Ва ўмовы конкурсу ўваходзіць таксама своячасовае забясьпячэньне школ падручнікамі, вучэбнымі і пісьмовымі прыладамі, заканчэньне да 1-га жніўня ўліку дзяцей школьнага ўзросту.

Поўнасьцю забясьпечыць школы настаўнікамі, правільна расставіць пэдагагічныя кадры, забясьпечыць кожнаму маладому настаўніку мэтадычную дапамогу, палепшыць матар'яльнае забясьпячэньне настаўнікаў, азнаёміць усіх настаўнікаў з новымі праграмамі і падручнікамі яшчэ да пачатку заняткаў,—вось тыя асноўныя задачы, якія пастаўлены ўмовамі конкурсу.

Для кіраўніцтва конкурсам пры Наркамасьвеце створан цэнтральны штаб з удзелам прадстаўнікоў грамадзкіх арганізацый. Пры гарсаветах і райвыканкомах ствараюцца спэцыяльныя конкурсныя камісіі. У сельсаветах за ход падрыхтоўкі да носага навучальнага году нясе адказнасьць старшыня сельсавету, які адначасова зьяўляецца ўпаўнаважаным раённай конкурснай камісіі.

У фонд прэміяваньня Наркамасьветы асигнавана 17.250 р. Для загадчыкаў раёну і школ, для інспэктара, настаўніцтва і старшынь сельсаветаў, якія дадуць лепшыя паказальнікі ў барацьбе за балявую сустрэчу навучальнага году, устаноўлены пэрсанальныя прэміі: 5 — па 750 руб., 10 — па 500 руб., 15 — па 300 руб. і 20 — па 200 руб. Для ўстаноў і арганізацый устаноўлены гапаровыя прэміі — пераходны сьцяг Наркамасьветы і грамата СНК БССР.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ТАБЛІЦА

10-га тыражу выйгрышаў пазыкі „ПЯЦІГОДКА—ЗА 4 ГАДЫ",

які адбыўся ў г. Карагандзе (Казакскай АССР) 27—30 мая 1933 году

А. Выйгрышы па 200 рублёў прыпалі на аблігацыі наступных сэрый бяспроцантна выйгрышнага выпуску:

№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый
00123	12426	22210	31025	42598	54350	66291	77399
00284	12443	22246	31304	42809	54358	66362	77620
00374	12614	22263	31384	42866	54440	66486	77657
00511	12808	22464	31420	42913	54446*)	66557т	77932
00523	12890	22540	31526	43181	54524	66630	78060
01227	12927	22637	31556	43419	54679	66998	78126
01286	13335	22759	31567	43935	54703п	67203	78413
01517	13471	22881	31815	44252	54704	67214	78546*)
02079	13649	22936	32116	44614*)	54810	67446	78779
02141*)	13718п	22966	32176	44644	54956	67450	78836
02230	13905	22988	32459*)	44896	55111	67600	79153
02240т	13944	23115	32533	45009	55280	68036	79395
02299	14134	23276	32701	45224	55303	68092	79630
02370	14220	23610	32804	45309	55327*)	68108	79689*)
02380	14429	23896	32894	45395	55724	69216	79727
02426	14684	23925	33300	45603	56630т	69269*)	79803
02517	14816	24092	33386	46109	56726т	69469	79829
02541	15044	24133	33439	46357	56848	69662	79873
02916	15089	24329	33538	46359	57748	69966	79882
02920	15144	24570	33558	46444	57796	70007*)	79945
03037	15458	24635	33791	46775	57953*)	70051	80424
03097	15845	24660	33865*)	46819	57985	70577	80443
03163	15886	24779	34539	47030	58119	70601	80690
03488	16094	24842	34625	47101т	58312	70614	80749
03580	16134	24895	34929	47295	58249	70891	80766п
03581	16490	25015	34966	47521п	58363	70928	80971
03675	16785	25339	35096т	47736	58424п	71019	81016
04055	16886	25723	35315	48108	58522	71035	81187
04512	17022	25754	35455	48157	59185	71236	81290
05149	17213	25894	35701*)	48217	59264т	71315	81695
05248	17519	26057	35778	48551	59450	71409	81760
05326т	17540	26061	35861*)	48623*)	60090	71562	81810
05346	17614	26249	35983	48787	60142т	71567	81972
05473	17740	26911	36057	48962	60274	71585	81994
05593	17751	26952	36117	49102	60415	71702	82274
05616	17761	27101	36246п	49123	60698	71772	82614
05915	17804	27172	36361	49315	60860	72195	82675
06153	17848	27294	36497	49402	61407	72355	83196
06185	18230	27322	36512	49622	61416	72381	83665
06194	18292	27462п	36620	49648	61957	72915	83675
06370	18293	27483	36888	49937	61889	73108	83691
06563	18524*)	27515	37177	49945	61987	73326	83793
06850	18578	27523	37323	50493	62028	73675	83866
07061*)	19095	27543	37520	50709	62031	73751п	84125п
07347	19358	27664	37582	50786	62166	73800	84576
07518	19576	27709	37686	50955	62177	73971	84649
07616	19707	27754	38051	51053	63213	74059	84754
07695	19940	27819	38144	51062	63490	74266	85268
07986*)	20012	27894	38196	51075	63620	74277	85527
08069	20132	28127	38423	51145	63643	74318	85530
08481	20255	28820	38453	51168	63856	74421*)	85846
08917	20461	29034	38678	51262	63898	74548т	85957
08943	20477	29181	38866	51635	64181	74881	86029
09117	20481	29349*)	39313	51960	64181	75562	86129
09126	20919	29480	39369	52189	64314	75675	86714
09420	20939	29628	39505	52233	64410	75737п	86791
09984	21164	29844	39725	52299	64452	75776	86949
10138	21159	29850	39809	52418	64637	75821	86950
10177	21198	30009	40056	52455	64719	75950	87081
10275	21257	30334	40571	52968	65519	75965	87276
10819	21282	30494	41396	53030	65534	76036	87317
10965	21362	30562	41528	53182	65536	76184	87450
10978	21461	30615	41754	53386	65599	76374	87536
11305	21647	30694т	41870	53432	65606	76559	87611
12114	21848	30813	41988	53653	65824	77228	87878
12240	21968	30916	42120	53670	66177	77279	88320
12272	21992	30973	42457	54239	66207	77351	88644

№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый
88849	89992	91974	93366*)	94153	95884	97316	98823
88950	90166	91997	93422	94470	96677	97639	98824
89052	90862	92139	93620	94564	96709	97613	98958
89141	90992	92172	93748	94977	96865	97780	99596
89184	91026	92774*)	93791	95107	96904	97646	99627
89195	91270	92940	93804	95274	96957	98367	99806*)
89720	91912	93008	94045	95644	97288	98555п	99964

Б. Выйгрышы ў 1.000 і 5.000 рублёў прыпалі на наступныя нумары сэрый і аблігацый бяспроцантна-выйгрышнага выпуску

№№ сэрый	№№ аблігацыі	сума выйгрыша ў руб.	№№ сэрый	№№ аблігацыі	сума выйгрыша ў руб.
02141	02	1.000	54446	10	1.000
07061	09	5.000	55327	06	1.000
07986	04	5.000	57953	05	1.000
18524	08	1.000	69269	09	1.000
29349	10	1.000	70007	05	1.000
32459	03	1.000	74421	03	1.000
33865	03	1.000	78548	03	1.000
35701	05	1.000	79636	04	1.000
35861	10	1.000	92774	05	1.000
44614	04	1.000	93366	06	1.000
48623	06	1.000	99806	04	1.000

А. Выйгрышы па 200 рублёў прыпалі на аблігацыі процантна-выйгрышнага выпуску наступных сэрый:

№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый
00262	12494	22669	38638	52081	60923	77291	88394
01056	12844	22783	39839	52200	61154	77370*)	88606
01087	13160	23701	39857	52276	61360*)	77643*)	89264
01316	13292	23786	39902	52683	61971	78008	89488
01334	13292	23941	40398	52746	62358	78332	89888*)
02379	13308	24298	41469	53166	64820*)	78699	90418
02957	13512	24710	41788	53514	65402	79579	90503
03193	13560	25909	42698	53963	65417	79729	90665
04034	13862	25974	43143	53985	65697	80377	91065
04585	13971	28104	43234	54399	65889	81098	91264
05553	14033*)	28203	43477	54461	66199*)	81169	93439
05596	14082	28975	43531	54648*)	66306	81527	93564
05697	14167*)	28993	44129	54930*)	66313	82417*)	93662
06140	14254	29039	44233	55613	67140	82763	94297
06263	14570	29140	44565	55648	68213	83175	94593
07791	15321	29339	45278*)	56187	68486	83677	94638
08507	15626	30207	46030	57199	69315	84017	94697
08603	16010	31398	46483	57515	69352	84180*)	94987
08713	16486	31537	46605	57723	69703	84351	95051
08880	16942	31874	46716	57942	69915	85159	95465
09035	17376	32261	46720	58043	70692	85263	96103
09538	17474	32693	46945	58118	72797	85554	96287
09976	17824*)	32960	47046	58175	72828	85673	96794
10174	18115	33627*)	47215	58648	74629	85799	98546
10314	18434	34534	47830	58809*)	74650	86482	98826
10801	18763	36237	48917	59442*)	75091	86640	98999
10967	19979	36336	49336	59919	75571	86776	99274
11183	20097	36510	49372	60064	76304	87875	99290
11603*)	20425	36361	51215	60376	76576*)	87503	99632
12265	22143*)	36435	51235	60705	76855	87541	99794
12476	22261	37544	51867	60845	76896	87659	

Б. Выйгрышы ў 1.000 і 5.000 рублёў прыпалі на наступныя нумары сэрый і аблігацый процантна-выйгрышнага выпуску:

№№ сэрый	№№ аблігацыі	Сума выйгрыша ў руб.	№№ сэрый	№№ аблігацый	сума выйгрыша ў руб.
11603	03	1.000	61360	02	1.000
14033	10	1.000	64820	02	5.000
14167	01	1.000	66199	01	1.000
17824	08	1.000	76576	03	1.000
22143	01	1.000	77370	08	1.000
33627	10	1.000	77643	01	1.000
45278	01	1.000	82417	03	1.000
54648	07	1.000	84180	05	1.000
54930	01	1.000	89888	03	1.000
58809	04	1.000	96193	08	1.000
59442	04	1.000			

Зноска * (зорачка), якая знаходзіцца ля некаторых нумароў сэрый указвае, што адзін з нумароў аблігацый гэтых сэрый выйграў 1.000 або 5.000 р.

Зноска «т» азначае, што выйгрыш прыпаў на ўсе 10 аблігацый указанай сэрыі па 3-й пазыцыі індустрыялізацыі.

Зноска «п» азначае, што выйгрыш прыпаў на ўсе 10 аблігацый указанай сэрыі па пазыцыі «Пяцігодка—у чатыры гады».

Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР.

Цэнтральны камітэт т-ва Чырвонага Крыжу

(Менск, Першамайская вул., дом № 7)

ШУКАЕ наступных грамадзян, якім належыць з Амэрыкі **страхоўка, пэнсія і інш. віды ўзнагароды** пасьля памёршых там іх радных.

АДШУКВАЮЦЦА:

1) Бацькі СТРОНГІНА Самуіла.
2) Рахіль РУБІНА—маці РУБІНА Макса.
3) Бацькі ПАСМУКСКАГА Ігната.
4) Мар'я ЦЫБІК—сястра Цыбіна Луні.
5) Еўданія Барон—маці Барона Давіда.
6) Іван і Іосіф ГЕНКОЎСКІ — браты Генкоўскага Пятра (Жэнкоўскія) (Жэнкоўскага).
7) Іван і Мар'я РОХІНЫ—бацькі і сястра РОХІНА Дж. (Родзін).
(8 Петр МІЧНІК—бацьна Пятра Мічніка.

Увага: Трэба ведаць, што прозьвішчы з Амэрыкі часта даюцца перабліытанымі пры перакладзе з ангельскай мовы на расійскую.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня — Гукавы мастацкі прыгодніцкі фільм **ЖЫЦЬ**

Інтэрнацыянал Каса—з 1 г. дня — Мастацкі фільм **КАЛАМУТА**

ДВІЦЯЧЫ кіно-тэатр Каса—з 1 г. дня — Мастацкі фільм **Салдацкі сын** у 6 частках

ПРАЛЕТАРЫ — Новы мастацкі фільм **ПАМЫЛКА ГЕРОЯ** драма ў 6 частках

„СПАРТАК" Каса—з 3 г. 30 м. дня — Замежны фільм **ДЗЯЎЧАТЫ ТАК САМА ПАМЫЛЯЮЦЦА** камэдыя ў 8 част.

ЗАВОЧНЫ СЭКТАР ВЫШЭЙШАГА ПЭДІНСТЫТУТУ АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР

на наступныя аддзяленьні: літаратурнае, гістарычнае, эканамічнае і пэдагагічнае.

Завочны сэктар ВПІ рыхтуе выкладчыкаў для 3-га канцэнтру (тэхнікумы, рабфакі, ФЗВ). Курс навучаньня 3 з пал. гады.

Прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю асьвету, рабочыя, калгаснікі, сяляне і служачыя, без адрыву ад вытворчасьці.

Прыём заяў з 1-га чэрвеня па 15-е жніўня па адрасу:

Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, завочны сэктар ВПІ.

Прыём іспытаў з 15 жніўня па 1-е верасьня.

Да заявы неабходна прыкладасьці наступныя дакументы: аб асьвеце, свідэтэльнае паходжаньні, меры працы і засьведчаную анкету.

ЗАВОЧНЫ СЭКТАР ВПІ.

Пра барацьбу з спэкуляцыяй хлебам у г. Менску

Пастанова № 14 Прэзыдыуму Менгарсавету РС і ЧД

Прэзыдыум Менскага Гарсавету РС і ЧД пастанаўляе:

1. Абавязаць органы РС міліцыі гор. Менску павесьці самую рашучую барацьбу з усімі асобамі, якія скупляюць і перапрадаюць хлеб.

2. Надаць начальнікам гарадзкіх аддзяленьняў міліцыі гор. Менску права чакпадаць на вінаватых у скупцы і перапрадажы хлеба штраф у адміністрацыйным парадку ад 50 руб. і да 100 рублёў з канфіскацыяй хлеба.

3. Даручыць пракурору гор Менску і начальніку міліцыі злосных спэкулянтаў і перакупшчыкаў хлеба прыцягваць да судовай адказнасьці.

Намесьнік старшыні Менскага гарадзкога савету КАРАНЕЎСКІ.
Сакратар КАПІЛЕВІЧ.

9 чэрвеня 1933 г. Гор. Менск.

Рэдакцыя газэты „Зьвязда", інспэкцыя пэн ЦКК РСІ, бюро парткалектыву і інспэкцыя па якасьці Белкаапсаюзу **12 гэтага месяца**

— СКЛІКАЮЦЬ НАРАДУ —

па якасьці выпякаемага хлеба і санітарным становішчы прадпрыемстваў хлебапячэньня і хлебных крам.

На нараду запрашаюцца: дырэкцыя трэсту Белпрамхлебу і хлебакамбінату, партыйная і прафсаюзная грамадзкасьць і ўсе старшыя майстры хлебазаводу і пякарняў.

Запрашаюцца таксама прадстаўнікі гарадзкой санітарнай інспэкцыі і грамадзкія